

ІНІЦЫЯТЫВЫ МЯСЦОВЫХ ДЭПУТАТАЎ БРЭСТЧЫНЫ МС

З-ЗА ЧАГО БАЛІЦЬ ГАЛАВА? 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 жніўня 2024 г.
СЕРАДА
№ 167 (30301)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

• Больш за 1,53 млн т торфу здабыта ў Беларусі з пачатку года.

• **Беларусь і Узбекістан у студзені — маі павялічылі гандаль паслугамі на 53 працэнты.**

• Завод тарфянога машынабудавання «Бальшавік» з 2020 года паставіў у Расію абсталявання і запасных частак да яго на суму больш як $627 тысяч.

• **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць ва ўсіх раёнах Беларусі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Люцыя МІХАЛЬЧУК, начальнік аддзела па арганізацыі харчавання Акадэміі адукацыі:**

*«У гэтым годзе харчаванне будзе арганізавана для 1,07 млн навучэнцаў у больш чым 2,6 тысячы школ. Каля 70 працэнтаў вучняў у краіне атрымліваюць бясплатнае харчаванне. Для тых, хто харчуецца платна, цэны на абед застануцца на леташнім узроўні. Для школьнікаў 6—10 гадоў, якія харчуюцца адзін раз на дзень, абед будзе каштаваць 2,29—2,98 рубля. Кошт залежыць ад таго, прыгатавана страва школай або іншымі арганізацыямі. Для школьнікаў 11—18 гадоў паабедаць адзін раз у сталовай будзе каштаваць ад 2,70 да 3,51 рубля. Традыцыйна да пачатку навучальнага года былі праведзены рамонтныя работы аб'ектаў харчавання. Набыта тэхналагічнае і халадзільнае сучаснае абсталяванне, пасудамыечныя машыны, кухонны і абедзенны інвентар. На гэтыя мэты ўжо затрачана каля 19 млн рублёў».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Настаўнік быў і застаецца апорай дзяржавы»

## Аб чым Прэзідэнт гаварыў на Рэспубліканскім педагагічным савеце

**Гэта традыцыйнае мерапрыемства, якое на самым высокім узроўні праводзіцца на пачатку новага навучальнага года. Каб адкрыта абмеркаваць праблемы і перспектывы, якія стаяць перад айчыннай сістэмай адукацыі, на Вялікім педсавеце ў Палацы Рэспублікі сабралася педагагічная грамадскасць з усёй краіны. У важнай размове прынялі ўдзел кіраўнікі навучальных устаноў, настаўнікі школ, выкладчыкі навучальных устаноў сярэдняга і вышэйшага звяна. Прэзідэнт агучыў асноўныя стратэгічныя задачы, якія стаяць перад айчыннай сістэмай адукацыі, указаў на некаторыя недахопы, адказаў на пытанні ўдзельнікаў Рэспубліканскага педсавета, сам задаваў вострыя пытанні педагогам і ўважліва выслухаў іх меркаванні.**



Фота БелТА.

### «Не трэба хаваць праблемы»

Найперш аб задачах і даручэннях, пастаўленых перад айчыннай сістэмай адукацыі, далажыў міністр адукацыі Андрэй Іванец. Пасля выступлення кіраўніка профільнага ведамства, у якім у асноўным былі сфармуляваны дасягненні апошняга часу, Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, ці ёсць праблемы, якія існуюць у адукацыйнай сферы. Прэзідэнт заўважыў, што, зыходзячы з даклада міністра адукацыі, праблем у гэтай сферы няма, а яны ўсё ж такі ёсць, і, па словах кіраўніка дзяржавы, іх павінна пачуць педагагічная грамадскасць.

«Адна з найважнейшых задач, якая сёння стаіць перад намі, у той жа час гэта і выклік для сістэмы адукацыі, — гэта выхаванне сапраўднага грамадзяніна і патрыёта на ўсіх узроўнях, — паведаміў Андрэй Іванец. — Ва ўсіх установах адукацыі, мы можам смела сказаць, выхаванне стаіць на першым месцы, а потым навучанне. Другая праблема — нам трэба вяртаць прэстыж прафесіі настаўніка. Так, мы сёння прымаем многія меры, з боку дзяржавы мы бачым тую падтрымку, якая аказваецца. Мы бачым і рост заробкаў, і тыя ўмовы, якія ствараюцца для нашых настаўнікаў. Аднак мы павінны вярнуць той сакральны сэнс настаўніка, тую павагу і статус у грамадстве, якія былі. Трэцяя, не менш важная задача, — мы павінны разумець тое, што наш малады чалавек — гэта не толькі працоўны рэсурс, гэта чалавечы капітал. Адпаведна мы павінны яго разглядзець не толькі праз прызму падрыхтоўкі пэўнага вузкага спецыяліста канкрэтнай галіны або канкрэтнага прадпрыемства, а ў цэлым рыхтаваць да будучага развіцця нашай краіны».

«Значыць, настаўніка няма: перабралі з навучаннем — трэба выхоўваць, залішне нават ужо навучаем, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — І, згодна з апошнім тэзісам, быццам бы і не тое рыхтуем, другі патрэбен чалавек. Дык тады чым займаецца адукацыя і школа?»

Прэзідэнт нагадаў сваё колішняе выказванне, што школа — гэта храм. «І, пераступаючы парог гэтага храма, ты павінен даваць сабе справаздачу, перш за ўсё — настаўнік. Гэта выканана даручэнне? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — Школьнікі прыходзяць у школу з трапятаннем? Ці разумеюць яны, куды яны прыйшлі?»

Па словах Андрэя Іванца, у апошнія гады ў гэтым плане дасягнуты сур'ёзныя вынікі. Ён расказаў, што гэтаму садзейнічала прыняцце Дзяржаўнага школьнага стандарту, дзе дакладна распісана, якія ёсць прававыя абавязкі і ў навучэнца, і ў бацькоў, і ў кожнага настаўніка. «І дысцыпліна, і парадак у першую чаргу ў адносінах да навучэнцаў сёння забяспечваюцца на добрым, высокім узроўні, — паведаміў міністр. — Так, яшчэ не ўсё зроблена. І вы правільна сказалі, што мы павінны паглядзець з аднаго боку і на навучэнца, і на педагога. Менавіта для гэтага мы прынялі «10 залатых правіл педагога» — каб настаўнік разумеў, якім ідэалам ён павінен адпавядаць і навучэнцы адносіліся да яго як да аўтарытэта».

Прэзідэнт пацікавіўся, ці ёсць у кіраўніка адукацыйнага ведамства прэтэнзіі да настаўнікаў. «Сёння ўся педагагічная грамадскасць, у тым ліку настаўнікі, самаадданa працуюць на карысць нашай краіны, — паведаміў Андрэй Іванец. — Хачу вас запэўніць, што не толькі кожны, хто сядзіць тут у зале, але і кожны настаўнік у нашай краіне разумее тыя задачы, якія стаяць перад ім, якую аддачу сёння ад сістэмы адукацыі чакае дзяржава».

Прэзідэнт патлумачыў, чаму ён задае такія пытанні ў гэтай зале. «Я сёння хачу адчуць, насамрэч мяне дэзынфармуюць або інфармуюць няправільна наконт таго, што ў вас гэта «зараза» пачала распаўсюджвацца ў выглядзе фальсіфікацый пэўных вынікаў, дакладаў, высноў і вы ўжо ў Міністэрстве адукацыі ўсё пачынаеце структураваць, — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — Я заўсёды вас папярэджваю, што ў мяне дастаткова рычагоў, метадаў, каб глыбока вывучыць праблему».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што яму дакладваюць аб тым, быццам у ВНУ ўсё цудоўна. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, колькі сёлета ў вышэйшыя навучальныя ўстановы недабралі студэнтаў і па якіх спецыяльнасцях. Як высветлілася, недабралі студэнтаў па сельскагаспадарчым і інжынерным профілях.

СТАР. 2—4





# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

## Што бацькі павінны сказаць дзецям перад навучальным годам?



**Неўзабаве празвініць першы званок, і школьнікі працягнуць, а хтосьці толькі пачне спасцігаць нешта вельмі важнае і карыснае, што абавязкова спатрэбіцца ў жыцці. Напоўняцца дзіцячым смехам паўпустыя за лета дзіцячыя садкі. Здаецца, у плане бяспекі бацькам можна выдыхнуць: — іх нашчадкі зноў занятыя і ўвесь час знаходзяцца пад кантролем дарослых. Але гэта толькі здаецца. Сапраўды, летнія канікулы (найбольш трывожны час у плане дзіцячай бяспекі) падыходзяць да завяршэння, але не варта расслабляцца. Бяспека — першае, аб чым павінны паклапаціцца дарослыя напярэдадні новага навучальнага года.**

СТАР. 5

# «Настаўнік быў і застаецца

*(Працяг.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Тое, што нам вельмі сёння трэба, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я сваё жыццё прэзідэнцкае пачынаў з таго, што чалавека трэба накарміць, даць магчымасць, каб чалавек накарміў сябе і сваю сям'ю, апрануць. А ўсё гэта дзе? У сельскай гаспадарцы. А як заўтра карміцца будзем? У што апранацца будзем? Усё — ад зямлі. Чаму тут у нас недабор? Я да гэтага часу лічу, што цікавейшай работы няма. Чаму ў моладзі няма павагі да сельскагаспадарчай ВНУ? Бо там брудна і пахі, а можа быць, і ВНУ вінаватыя ў тым? А інжынеры? Як без інжынераў заўтра жыць будзем? Юрысты і гісторыкі ні электрааўтамабіль не створаць, ні атамную станцыю не пабудуюць. Патрэбны перш за ўсё яны — інжынеры. А дзе яны?»

Кіраўнік дзяржавы выказаў сумненне ў тым, што вырашана праблема, звязаная з запатрабаванасцю ваенных спецыяльнасцяў. «Краіну заўтра хто абараняць будзе? — пацікавіўся ён. — Мы з вамі ўстанем і пойдзем? Пойдзем. Але шмат толку будзе ад нас на фронце, у штурмавых атрадах?»

Прэзідэнт патлумачыў, што наўмысна засяродзіў увагу прысутных на гэтых пытаннях, каб не думалі, што Рэспубліканскі педсавет стане чарговым фармальна-бюракратычным мерапрыемствам, а праблемы, якія існуюць, так і застануцца. «Праблемы гэтыя — ад нас з вамі, ад мяне і ад настаўніка, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Без вас, без настаўнікаў, не будзе нікога. І самага галоўнага — здароўя не будзе, бо, калі вы не навучыце ў школе, урачоў не будзе».

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на працоўным выхаванні моладзі. «Ва ўсіх школах ёсць прышкольныя, прысядзібныя ўчасткі? Не ва ўсіх, — канстатаваў ён. — А можа быць, нам кожнай школе, пачынаючы з ВНУ, можа, з Міністэрства адукацыі, кожнаму па калгасу?»

Прэзідэнт адзначыў, што перад сістэмай адукацыі стаяць вельмі сур'ёзныя пытанні. «Так, мы дасягнулі небывалых вышынь, ніхто не думаў 20 гадоў таму, што мы можам іх дасягнуць, — канстатаваў беларускі лідар. — Але калі мы не ўбачым, што ў нас фарміруецца доўгатэрміновы парадак праблемы, мы рухнем у тую ж бездань, у якой былі пасля распаду Савецкага Саюза. Мы гэта павінны бачыць, і не трэба рэтушаваць, не трэба гэта хаваць».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў, каб выступленні былі шчырымі і ў іх былі агучаны перш за ўсё праблемы з улікам той абстаноўкі, якая складваецца. «Сфера адукацыі для мяне — найважнейшая, — патлумачыў ён. — Я разумею, што адбываецца, паколькі па духу ваш чалавек — настаўнік. Ды і цяпер, будучы Прэзідэнтам, 50 %, можа, больш маёй работы — гэта настаўніцтва. Я павінен бачыць, аналізаваць і вучыць усю краіну. Мы з вамі ў адной лодцы, і дзявацца нам няма куды. Цямніць, падманваць і ўпрыгожваць сітуацыю не трэба».

## «Усё павінна быць шчыра і празрыста»

Звяртаючыся да аўдыторыі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, ацэньваючы гэту сустрэчу, думае: а які вынік будзе ад таго, што ў такім складзе сабраліся. «Тут — эліта нашага педагагічнага грамадства, — падкрэсліў ён. — Тут найлепшыя, дык ці будзе эфект ад нашай размовы? Думаю, што важна тое, аб чым мы сёння кажам, але яшчэ больш важна, што вы маеце магчымасць сустрэцца не толькі з Прэзідэнтам, пачуць мой пункт гледжання і нават не пачуць, а больш адчуць, маю палітыку, пазіцыю і пункт гледжання. Але вы маеце магчымасць камунікаваць паміж сабой, многія вучыліся ў ВНУ адных. Гэты камунікат — найважнейшы вынік нашага сённяшняга мерапрыемства. Таму, не перабольшваючы ролю цяперашняга савета, я кажу аб тым, што мы недарэмна сёння сабраліся напярэдадні новага навучальнага года па ўжо ўстаноўленай традыцыі, праводзячы гэты вялікі педагагічны савет. Адкрыта абмяркоўваем праблемы і перспектывы айчыннай сістэмы адукацыі. Для мяне гэта яшчэ важна і таму, што свае першыя крокі я рабіў у школе не толькі школьнікам, але і выкладаючы гісторыю».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што адукацыя — фундаментальная сфера нашага жыцця, якая пранізвае абсалютна ўсе галіны і вызначае развіццё ўсёй нацыі. А таму людзі, якія працуюць у гэтай сферы, па яго словах, павінны быць бездакорныя. «Вы — і выхавацелі, і настаўнікі, і выкладчыкі — закладваеце каштоўнасныя арыенціры, і ў гэтым ваша найвышэйшая адказнасць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Хто, калі не вы, павінен фарміраваць у дзяцей правільнае ўспрыманне свету, разуменне ўсіх працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве і дзяржаве».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў педагагічнай працы няма дробязяў, бо любыя нестыкоўкі, недапрацоўкі прыводзяць да таго, што штарміць усю краіну — ад малога да вялікага. І Прэзідэнт агучыў канкрэтныя прыклады. «Вы памятаеце, які негатыўны рэзананс у грамадстве выклікала летась гісторыя з падлікамі балаў за цэнтралізаваны экзамен, — нагадаў ён. — Не ведаю, правільна або не, мяне інфармуюць аб тым, што вы гэта яшчэ не зжылі да канца. Гэта мы вывучым у найбліжэйшы час. Усё павінна быць шчыра, празрыста. І калі ў Мінадукацыі шмат фізікаў і матэматыкаў, якія ўмеюць ствараць формулы і лічыць па іх, напэўна, іх трэба ў школу адправіць, каб яны занадта не разумнічалі, ствараючы тыя ці іншыя сістэмы пры падліку гэтых балаў».

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў: усё павінна быць арыентавана на настаўніка і сярэдняга жыхара нашай краіны. Як ацанілі гэтыя балы, перш за ўсё павінны разумець вучні і іх бацькі. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што і ў сёлетнюю ўступную кампанію, нягледзячы на даволі зладжаную працу, людзі скардзіліся на вялікія чэргі пры падачы дакументаў. На роўным месцы, па яго словах, узнікла пытанне і са школьнай формай. «Праблемы вялікай не бачу, але рэагаваць трэба, — лічыць беларускі лідар. — Здавалася б, дробязь, але дробязяў у нашай рабоце няма».

## «Гэта выклік. І сістэма адукацыі павінна на яго адказваць»

Па словах Прэзідэнта, сфера адукацыі — гэта дзяржаваўтваральная галіна, якая патрабуе сур'ёзных укладанняў. «І мы ўкладваем і будзем укладваць у яе сродкі, — заявіў ён. — Калі сёння не будзе адукаванай, выхаванай у сваёй краіне моладзі, заўтра не будзе і краіны».

За апошнія тры гады дзяржава накіравала на развіццё сістэмы адукацыі амаль 30 мільярдаў рублёў. Пабудаваны і капітальна адрамантаваны 73 установы адукацыі, яшчэ дзевяць узвядуць да канца года. Як дакладваюць кіраўніку дзяржавы, ахоп дашкольнай адукацыяй у краіне практычна стапрацэнтны.

Там, дзе няма школы ці дзіцячага садка, арганізаваны падвоз. У гэтых мэтах значна абноўлены аўтапарк. Толькі з 2022 года ў школы пастаўлена каля 700 аўтобусаў. Але, як заўважыў Прэзідэнт, ёсць асобныя нараканні з боку бацькоў. У гэтай сувязі мясцовым органам улады сумесна з Мінадукацыі даручана яшчэ раз вярнуцца да пытання падвозу дзяцей у месцы навучання.

«Разбярыцеся ў рэшце рэшт, пакуль мне не прыйшлося разбірацца, — даручыў кіраўнік дзяржавы. — Як выкарыстоўваюцца школьныя аўтобусы? Мы іх вызначылі, што гэта аўтобусы для дзяцей, у крайнім выпадку для вырашэння пэўнага пытання (не пастаянна) для школ, але не для іншых патрэб».

Дзяржавай шмат зроблена для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, нават нягледзячы на санкцыі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сёння літаральна ўсе школы ў краіне маюць тэхнічныя магчымасці для доступу да любых інфармацыйных адукацыйных рэсурсаў, не кажучы ўжо пра ВНУ і каледжы. Прэзідэнт запэўніў, што практыка выкарыстання дыстанцыйных форм навучання будзе пашырацца настолькі, наколькі гэта патрэбна, і пад кантролем дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на яшчэ адзін паказчык высокай якасці айчыннай адукацыі — вынікі школьнікаў на міжнародных алімпіядах. Толькі за апошнія тры гады яны заваявалі больш за 200 медалёў. Асабліва радуюць, па словах Прэзідэнта, перамогі па дакладных дысцыплінах, якія з'яўляюцца базавымі пры падрыхтоўцы кадраў для навукаёмістых і высокатэхналагічных галін эканомікі.

Прэстыж нашых ВНУ пацвярджаецца штогадовым ростам колькасці замежных студэнтаў. «Сёння гэта звыш 30 тысяч чалавек больш як са ста краін свету, — удакладніў Прэзідэнт. — І попыт на атрыманне адукацыі ў Беларусі замежнікамі пастаянна павялічваецца».

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што збольшага санкцыйная палітыка прымусіла скарэкціраваць планы развіцця галіны. Беларусь хутка сарыентавалася, захавала станоўчую дынаміку і знайшла новыя пункты росту. Мы сталі больш актыўна працаваць з Расіяй, Кітаем, краінамі Глабальнага Поўдня.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што мяняюцца адносіны грамадства да сістэмы адукацыі. Сацыялагічныя апытанні, якія правяла Нацыянальная акадэмія навук, паказваюць, што больш як 73 % рэспандэнтаў станоўча ацэньваюць работу школы. І Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь фіксуе значнае зніжэнне зваротаў грамадзян па пытаннях адукацыі. У параўнанні з мінулым годам іх колькасць скарацілася на 43 % (усяго 278 зваротаў). Пры гэтым сацыяльна значных праблем заяўнікі не ўзнімалі.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў: нядзіўна, што на нас нарастае ціск звонку. «Усе спробы дыскрэдытаваць беларускую сістэму адукацыі мы бачым, — паведаміў ён. — Але ў мяне ўзнікае толькі адно пытанне пры гэтым: калі мы так дрэнна вучым, дык навошта ганяцца за нашымі выпускнікамі, навошта іх цягнуць туды да сябе? Адказ відавочны. Маладыя нашы суседзі — літоўцы, латышы, палякі, эстонцы — ужо даўно шукаюць шчасця ў Еўропах і за акіянам. Цяпер гэтым суседзям і іншым патрэбны нашы дзеці. Для Беларусі гэта выклік. І менавіта сістэма адукацыі павінна на яго адказваць. Гэта імператыў і адначасова кірунак для нашай з вамі работы».



Фота БелТА.

## «Навукоўцам трэба рыхтаваць змену»

Павышэнню якасці адукацыі ўдзяляецца вялікая ўвага на самым высокім узроўні. Гэтая тэма не сыходзіць з парадку дня Прэзідэнта. Увесь час пытанні, якія датычацца сферы адукацыі, пастаянна абмяркоўваюцца на нарадах па эканоміцы, развіцці навукі, сельскай гаспадаркі, рэгіянальнай палітыцы. Кіраўнік дзяржавы анансаваў, што роля навукі будзе значна ўзмоцнена і павялічана літаральна з будучага года.

«Звышідэя, дасягненню якой падпарадкаваны ўсе рашэнні, што прымаюцца на такіх нарадах, — развіццё прарыўных тэхналогій, адкрыццё новых галін, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Для гэтага нам патрэбны кваліфікаваныя кадры, здольныя крэатыўна думаць, вырашаць нестандартныя задачы, пераймаць перадавы вопыт, укараняць яго ў рэальную вытворчасць і сацыяльную сферу».

Самым сур'ёзным чынам у дзяржаве ўзяліся за навуку. Пераарыентуецца работа Нацыянальнай акадэміі навук, сілы і веды накіроўваюцца на развіццё перспектыўных навукаёмістых працэсаў.

Па меркаванні беларускага лідара, роля навукі ў ВНУ павінна толькі ўзрастаць. «Яна з'яўляецца ключавым элементам навуковага патэнцыялу краіны, — лічыць Прэзідэнт. — Гаворка ідзе пра пашырэнне магчымасцяў для здольнай моладзі рэалізаваць сябе ў такой важнай для нас сферы. І гэтыя магчымасці не павінны быць сканцэнтраваны толькі ў сталіцы. Я вельмі спадзяюся, што вы мяне пачулі. Навукоўцам трэба рыхтаваць змену, перадаваць свае веды нашай таленавітай і адоранай моладзі. Гэта маё жалезнае патрабаванне».

## «Адсядзецца нікому не ўдасца»

Кажучы аб выніках праверкі дзейнасці ВНУ і рэктараў, праведзенай па яго даручэнні, Прэзідэнт паведаміў, што гэта толькі пачатак і адсядзецца нікому не ўдасца. «Мы маем намер самым бескампрамісным чынам навесці парадак ва ўніверсітэтах, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Так, мы будзем падтрымліваць нашых выкладчыкаў, кіраўніцтва ўніверсітэтаў і фінансава, і матэрыяльна, але і патрабаванне

# апорай дзяржавы»

будзе павялічвацца». У тым ліку ў гэтых мэтах кіраўніком дзяржавы запланавана наведванне шэрагу рэгіянальных і сталічных навучальных устаноў. «Прашу сур'ёзна рыхтавацца», — звярнуў увагу прысутных Аляксандр Лукашэнка.

На сустрэчы з рэктарамі, якая адбылася ў лютым гэтага года, Прэзідэнт гаварыў аб неабходнасці перагляду пераліку спецыяльнасцяў у адпаведнасці з патрэбамі эканомікі, абнаўлення навучальных праграм, узмацнення практычнага складніка навучання. «Я не разумею, чаму ўчарашняга дыпламаванага выпускніка трэба давучваць? — задаў слушнае пытанне кіраўнік дзяржавы. — Хто ў гэтым вінаваты? ВНУ, якая не дае патрэбных ведаў, або работадавец, які не жадае дапамагаць у адаптацыі на першым працоўным месцы? Што гэта? Такія падыходы ў сучасных умовах, калі прадпрыемствы маюць патрэбу ў падрыхтаваных кадрах, — недазвалялная раскоша».

З іншага боку, кіраўнікам устаноў адукацыі, і ў прыватнасці рэктарам, лічыць Аляксандр Лукашэнка, трэба быць больш мабільнымі, разумець, якія факультэты, спецыяльнасці і формы навучання неабходна ўводзіць, а ад чаго адмаўляцца.

Пастаўлена задача разабрацца і з мэтавымі накіраваннямі. «Быццам бы сістэма ёсць, а належнай празрыстасці і эфектыўнасці няма, — пераканаsuccessfully кіраўнік дзяржавы. — Прайшло шмат часу, калі мы прынялі глабальныя рашэнні па мэтавіках. Настаў час падвесці вынікі. Так, кіраўнікі прадпрыемстваў адзначаюць, што ўзровень падрыхтоўкі патрэбных кадраў часта вымушае жадаць лепшага, дзесьці не так і не таму навучылі. Падумайце, можа, варта ўвесці практыку папярэдняга размеркавання да заканчэння ВНУ (можа быць, на трэцім курсе), каб будучага маладога спецыяліста арыентавалі на асаблівасці работы канкрэтнага прадпрыемства. Гэтае пытанне трэба сур'ёзна прапрацаваць».

## «Трэба ісці на вытворчасць»

Агучыў Аляксандр Лукашэнка прэтэнзіі і да саміх заказчыкаў кадраў. Па яго словах, менавіта яны павінны вызначыць кампетэнцыі, якія патрэбныя спецыялісту, актыўна ўдзельнічаць у распрацоўцы навучальных праграм і кваліфікацыйных патрабаванняў. «Тут ініцыятарамі павінны быць выкладчыкі, ВНУ, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Ніякі інжынер з вытворчасці або намеснік дырэктара, майстар да вас не прыйдзе і не скажа: «Давайце перапрацуем праграму». Вы павінны туды прыйсці і прапанаваць».

Па меркаванні кіраўніка дзяржавы, навучанне неабходна будаваць з улікам інтарэсаў і адукацыі, і рэальнага сектара. «І ўвогуле, калі вы даяце абітурыенту мэтавае накіраванне, то павінны яго курыраваць увесь перыяд навучання, — пераканаaны Аляксандр Лукашэнка. — Гэта ваша зона адказнасці, як і наступнае замацаванне маладога спецыяліста».

Прэзідэнт расказаў, што яму паступае інфармацыя аб недапушчальным стаўленні да выпускнікоў, якія прыбылі па размеркаванні. «Нярэдка іх прымушаюць выконваць працу, якая наогул не патрабуе кваліфікацыі, — канкрэтызаваў ён. — І гэта я яшчэ мякка выказаўся. Аналагічная сітуацыя з жыллём, калі ўмовы пражывання толькі з вялікай нацяжкай можна назваць здавальняльнымі. Яшчэ раз хачу падкрэсліць тое, што казаў не адзін раз: палітыку жыллёвага будаўніцтва мы пачалі пераглядваць. Сур'ёзна пераглядваць. Прыярытэт будзе аддадзены арэнднаму жыллю. Калі трэба ВНУ, калі трэба школе, калі трэба каледжу, заводу, фабрыцы, людзям, мы ім акажам падтрымку ў будаўніцтве жылля. Яны павінны мець магчымасць прапанаваць тым людзям, якія хочуць у іх працаваць, у тым ліку і жыллё. Я ўжо не кажу пра нармальны заробак».

Прэзідэнт заўважыў, што пасля размеркавання асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў кожныя два гады, а то і часцей, просяць новага спецыяліста ўзамен таго, які адпрацаваў па размеркаванні. «Гэта абсалютна недапушчальна!» — лічыць ён. Аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму, ураду даручана яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытання.

Беларускі лідар прапанаваў больш актыўна развіваць сувязь каледж — ВНУ, ісці далей па гэтым шляху. Па яго словах, у нашых каледжах на добрым узроўні арганізавана практычная падрыхтоўка. Аляксандр Лукашэнка і сам гэта бачыў, калі наведваў такія ўстановы адукацыі. Па яго меркаванні, дзе-нідзе яшчэ трэба ўмацоўваць матэрыяльную базу і закупляць сучасную тэхніку. «Замест таго, каб ствараць цэхі ў каледжах, трэба ісці на вытворчасць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — І калі хтосьці гэты працэс будзе тармазіць, далажыце, калі ласка».

Прэзідэнт яшчэ раз акцэнтаваў увагу на тым, што сёння трэба выпускаць больш спецыялістаў сярэдняга звяна і накіроўваць на навучанне ў ВНУ толькі тых, хто замацаваўся ў прафесіі. «У такіх людзей і практыка ўжо ёсць, і матывацыя адпаведная. Яны ўжо на зуб паспрабавалі гэтую прафесію», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы.

## «Тэма патрыятычнага выхавання павінна быць у надзейных руках»

Закранаючы пытанні выхавання, галоўнае, на што арыентуе Прэзідэнт, — тут няма адказнасці толькі аднаго міністэрства або ведамства. «І вельмі добра, што апошнім часам вайскоўцы і прадстаўнікі органаў унутраных спраў актыўна ўключыліся ў ідэалагічную і выхаваўчую работу, дапамагаюць нашай школе, — заўважыў ён. — Хоць сапраўдныя мужыкі пачалі туды заходзіць. Гэта вельмі правільна. Тэма патрыятычнага выхавання павінна быць у надзейных руках».

Пры гэтым Прэзідэнт парэкамендаваў не забываца пра яшчэ аднаго «выхавацеля» нашых дзяцей — агрэсіўнага і часам вельмі небяспечнага. Размова ідзе пра інтэрнэт. «Нам кінуты чарговы сур'ёзны выклік, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы ўсе — педагогі, бацькі, праваахоўныя органы, грамадскія аб'яднанні, лідары меркаванняў — павінны быць максімальна кансалідаваны. Трэба ведаць, ці дастаткова мы робім для фарміравання ў дзяцей навыкаў бяспечных паводзін у сеціве, разумення асноў інфармацыйнай гігіены. Неабходна прааналізаваць і ўзмацніць гэту работу значна».

Па словах беларускага лідара, можна толькі вітаць усё, што робіць школа ў гэтым кірунку: экскурсіі, пошукавая работа, ваенна-патрыятычныя клубы і класы. «Гэта адцягвае дзіця ад непатрэбнага інтэрнэт-асяроддзя, паказвае, наколькі цікавым можа быць рэальнае жыццё, а не віртуальнае, якія магчымасці адкрыты для рэалізацыі кожнага, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы гэтую пазакласную работу бачым. Яна вельмі важная, патрабуе шмат часу. Аднак недапушчальна, калі пры гэтым настаўнік задушаны бессэнсоўнай бюракратычнай пісанінай, якую потым ніхто не чытае. Проста сорамна пра гэта казаць — пра гэтую бюракратычную пісаніну. Я думаю, пасля гэтай размовы, вы, Андрэй Іванавіч (міністр адукацыі. — **«Зв.»**), прымеце радыкальнае рашэнне. Настаўнік не павінен займацца нейкім барахлом, пісаць нейкія справаздачы, якія не патрэбны... Я больш на гэтую тэму размоў чуць не павінен».

Міністру адукацыі даручана асабіста прыняць рашэнне. Кіраўнік дзяржавы неаднойчы казаў аб недапушчальнасці такіх падыходаў. Дзе і хто яго да гэтага часу не пачуў — бачаць.

Прэзідэнт лічыць, што варта звярнуць больш пільную ўвагу на савецкі досвед працоўнага выхавання і адаптаваць яго да сённяшніх рэалій. «Не будзеце займацца працоўным навучаннем-выхаваннем у школе, напалову ваша эфектыўнасць на ўроках прападзе, — папярэдзіў ён. — Падумайце, як нам адрадзіць працоўную практыку для школьнікаў. Няхай яны ўбачаць, наколькі сёння ступіла наперад сфера рэальнай вытворчасці, заснаванай на сучасных тэхналогіях. Няхай паглядзяць на спецыялістаў, якія там працуюць, пагутараць з імі, пазнаёмяцца з умовамі працы, сучаснай тэхнікай і абсталяваннем, на якім яны працуюць. Гэта будзе самая лепшая прафарыентацыя».

Усе ведаюць стаўленне кіраўніка дзяржавы да фізічнай культуры і здаровага ладу жыцця. «Мяне вельмі абурае, што ў асобных школах урокі фізкультуры сталі фактычна неабавязковымі, ды і ў ВНУ таксама, — падзяліўся Прэзідэнт. — Хочаш — прыходзь на заняткі, хочаш — не. Дык якая тады ў моладзі будзе матывацыя займацца спортам? Тут трэба навесці самы сур'ёзны парадак, бо фізкультура і спорт — гэта перш за ўсё здароўе нашых дзяцей, а яшчэ дысцыпліна і выхаванне характару, што заўсёды ў жыцці спатрэбіцца».

## «Пытанні сацыяльнай падтрымкі настаўнікаў — найпрыярытэтнейшы кірунак нашай палітыкі»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што настаўнік быў і застаецца апорай дзяржавы. «Вядома, з якой павагай я стаўлюся да вашай працы, — адзначыў ён. — Пытанні сацыяльнай падтрымкі настаўнікаў, умацавання становішча іміджу педагога і школы — найпрыярытэтнейшы кірунак нашай палітыкі. І работа ў гэтай сферы будзе прадоўжана».

Да 2025 года плануецца выраўнаваць заработную плату работнікаў адукацыі з сярэдняй па краіне. У Беларусі пачалі ўзводзіць дамы для настаўнікаў. У Мінскім раёне днямі ўручаць ключы жыхарам першага такога дома. Плануецца аналагічнае будаўніцтва і ў Брэсцкай вобласці. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў падумаць аб мэтавай праграме будаўніцтва жылля для работнікаў сацыяльнай сферы ва ўсіх рэгіёнах.

«Сёння ў школы прыходзяць дзеці новай тэхналагічнай эпохі, тыя, хто з пялёнак трымае ў руках гэты няшчасны гаджэт — гэта данасць, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — І вы яшчэ ўчора павінны былі падумаць, з якімі методыкамі, праграмамі, з якім букваром будзеце ўваходзіць у клас да такіх вучняў. І не варта забываць, што сапраўдны настаўнік павінен умець працаваць не толькі з дзецьмі, але і з іх бацькамі. Так, бацькі таксама іншыя: ці самаўхіленыя, ці залішне патрабавальныя з'яўляюцца. Хочуць, каб школа зрабіла з іх дзіцяці новых Энштэйнаў. Але аўтарытэтны педагог здолее зрабіць іх усіх саюзнікамі ў адукацыйным працэсе. Па меншай меры, гэта ваш крыж».

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, сёння перад айчыннай сістэмай адукацыі, як і перад усёй краінай, стаяць самыя сур'ёзныя задачы. «І тое, як яны будуць вырашаны, залежыць літаральна ад кожнага з нас, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да ўдзельнікаў Рэспубліканскага педагагічнага савета. — Але ў мяне няма сумненняў, што мы з імі справімся».

## «Істотных змяненняў у сістэме адукацыі больш не будзе»

Рэзюмуючы, Прэзідэнт сфарміраваў асноўныя патрабаванні да сістэмы адукацыі і асноўныя стратэгічныя задачы, якія будуць стаяць у найбліжэйшы час. «Мы рэфармавалі адукацыю шмат гадоў запар, — нагадаў беларускі лідар. — Страцілі ўжо лік рэформам, забылі людзей. Істотных змяненняў, як я і абяцаў, у сістэме адукацыі больш не будзе. Мы не можам кожны год акунаць педагагічную грамадскасць, уладу, саміх сябе ў рэфармаванне, пераналадку слоў і будаўніцтва новага ў сістэме адукацыі. Не будзем рабіць, бо ўжо нямала зроблена. Трэба спыніцца, папрацаваць, зрабіць адпаведныя высновы на тым, што мы з вамі стварылі. Там, дзе патрэбна будзе дашліфоўка, мы гэта зробім. Дашліфоўка заўсёды патрэбна будзе. Усе вузкія месцы мы бачым».

Перш чым прыйсці на педсавет, Прэзідэнт вывучыў вялізны масіў інфармацыі: пачынаючы ад зваротаў грамадзян, даных сацыялагічных даследаванняў, заканчваючы аналітычнымі матэрыяламі кантралявальных органаў. Аляксандр Лукашэнка вызначыў ключавыя кірункі, па якіх будзе праводзіцца гэтая даналадка.

***Першае — прэстыж прафесіі.*** «Абсалютна правільна, — падкрэсліў ён. — Без прэстыжу, без пад'ёму аўтарытэту настаўніка, кіраўніцтва школы няма чаго казаць аб эфектыўнасці адукацыі. Настаўнік павінен быць больш чым святым чалавекам у школе. Таму трэба зрабіць максімум у гэтым плане. Перш за ўсё, вы павінны гэта зрабіць. Вы павінны гэтага захацець. А мы павінны аказаць усялякую падтрымку. Настаўнік — гэта чалавек Прэзідэнта. Таму 50 % вашай нагрузкі — гэта мая нагрузка. Усё, што датычыцца тэмы праблемных сем'яў і ўмоў жыцця, сацыяльна ўразлівых дзяцей, прафілактычнай, арганізацыйнай работы, настаўнік адзін на адзін з гэтымі пытаннямі не справіцца. Нікуды не варта, калі пракуроры і дзяржкантроль часцей ходзяць па асобных школах, чым начальнік ад адукацыі. Вядома, прэстыж любой прафесіі мае на ўвазе годны заробак. Па заробках мы ўпершыню ў гісторыі наблізіліся да сярэдняй па краіне, ніколі такога не было. Тут арыфметыка простая: вы рыхтуеце канкурэнтаздольных спецыялістаў — эканоміка расце — растуць і вашы даходы».

***Другое. «Патрыятызм — фундамент адукацыі,*** — падкрэсліў беларускі лідар. — Зроблена нямала. Мы можам казаць аб кантрэтных выніках, фіксуем высокія конкурсы на ваенныя спецыяльнасці, бачым, як расце цікавасць моладзі да пошукавай работы, студатрадаўскага руху, як знікаецца колькасць выпускнікоў, якія з'язджаюць вучыцца за мяжу. Работу трэба працягваць. Тым больш тут хлусні нямала. І трэба памятаць: патрыётaм можа выхаваць, як я казаў, толькі патрыёт».

***Трэцяе. «Таленты павінны заставацца ў нашай краіне,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Работу са здольнымі дзецьмі ў школах і ВНУ неабходна ўзмацніць. Мэта адна — яны павінны жыць і працаваць у сваёй краіне. У наступнай пяцігодцы створым адукацыйны хаб сусветнага ўзроўню, не горшы за Гарвард. Напрыклад, на базе аднаго з факультэтаў БДУ пабудуем самы сучасны кампус і арганізуем па поўным фабрычным цыкле вышэйшую школу па пэўнай спецыяльнасці, іншых кірунках і гэтак далей».

***Чацвёртае. «Прафесіі будучыні,*** — агучыў Прэзідэнт. — Слаба з кірункам развіцця спецыяльнасцяў, якія знаходзяцца на стыку некалькіх дысцыплін: напрыклад, тэлемедыцына, агракібернетыка, біяхакінг. Але будзем памятаць, што штучны інтэлект не заменіць вас — вобраза настаўніка. Асабліва ў выхаванні навыкаў адаптыўнасці і нацэленасці на будучыню».

***Пятае. «Для нас найважнейшы эканамічны паказчык — экспарт,*** — канстатаваў беларускі лідар. — Экспарт — гэта пытанне жыцця нашай краіны. Экспарт — брэнд Беларусі як краіны з адкрытай эканомікай. Патэнцыял экспарту паслуг адукацыі выкарыстоўваем недастаткова, амаль не рыхтуем спецыялістаў з навыкамі знешняй камунікацыі, якія ўмеюць штурхацца локцямі на жорсткіх знешніх рынках, а павінны. Літаральна са школьнай лаўкі».

Падсумоўваючы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пры ўсіх даналадках і інавацыях нязменным застаецца базавы падыход да беларускай сістэмы адукацыі. «Гэта абавязкова роўны доступ да атрымання адукацыі — гэта святое», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў прысутным за ўдзел у Рэспубліканскім педагагічным савеце, павіншаваў усіх з надыходзячым Днём ведаў, пажадаў моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, аптымізму і невычэрпнай творчай энергіі.

# «Настаўнік быў і застаецца апорай дзяржавы»

**Удзельнікі Рэспубліканскага педсавета выступілі з дакладамі. Прэзідэнт падрабязна цікавіўся пытаннямі, на якія ў сваіх выступленнях звярталі ўвагу прадстаўнікі сістэмы адукацыі, выказваўся па актуальнай тэматыцы. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні ўдзельнікаў педагагічнага савета**

## Ад шчыльнага ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў да выхавання кадравага рэзерву

У прыватнасці, **дырэктар Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна Юлія САМАТЫГА** засяродзіла ўвагу на тым, што сакрэтам паспяховасці ўстановы адукацыі з'яўляецца стварэнне сучаснага адукацыйнага асяроддзя, якое садзейнічае павышэнню якасці навучання і выхавання. Яна расказала аб гэтым на прыкладзе сваёй сельскай навучальнай установы, выпускнікі якой паспяхова паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, многія з якіх потым вяртаюцца ў сцены гімназіі — ужо ў якасці маладых спецыялістаў.

Па словах дырэктара навучальнай установы, для кіраўніка любой сферы, няхай гэта будзе сельская гаспадарка або медыцына, прыцягненне высокакваліфікаваных кадраў — галоўная задача. «Практыка даказала, што адным з варыянтаў яе вырашэння з'яўляецца ранняя прафарыентацыйная работа, адкрыццё класаў прафесійнай накіраванасці, а таксама мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў, — канкрэтызавала Юлія Саматыга. — На тэрыторыі Барысаўскага раёна найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца класы аграрнай, інжынернай, педагагічнай і ваенна-патрыятычнай накіраванасці».

Выступаючы з дакладам на тэму «Удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў у каледжы», **дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа інавацыйных будаўнічых тэхналогій імя Жыжаля Інэса КУЗЬМІНА** прапанавала стварыць вучэбныя ўчасткі на буйных прадпрыемствах краіны. «Не заўсёды каледжы паспяваюць за імклівым працэсам абнаўлення тэхналогій і абсталявання ў рэальным сектары, — агучыла праблему яна. — Сама сістэма адукацыі з ёй не справіцца».

Па меркаванні Інэсы Кузьміной, каледжам вельмі важна наладзіць цеснае ўзаемадзеянне з заказчыкамі кадраў, арганізацыямі розных сектараў эканомікі. Мінскі дзяржаўны каледж інавацыйных будаўнічых тэхналогій паспяхова рэалізоўвае гэты падыход ва ўзаемадзеянні з 16 найбуйнейшымі базавымі прадпрыемствамі сталіцы.

«Навучэнцаў арыентуюць на тое, што прафесія рабочага — гэта не аднастайная фізічная праца, але яшчэ і інтэлектуальная, якая патрабуе валодання новымі кампетэнцыямі, у тым ліку лічбавымі, — паведаміла дырэктар навучальнай установы. — Мы даказваем, што хлопцы і дзяўчаты, якія ў школах паказваюць невысокі ўзровень вынікаў навучання, могуць быць вельмі паспяховымі ў прафесіі. Каб сфарміраваць і папулярызаваць вобраз чалавека рабочай прафесіі, мы пастаянна праводзім разнастайныя прафарыентацыйныя мерапрыемствы. Прапануем актыўна на дзяржаўным узроўні працягнуць фарміраванне ў грамадстве іміджу чалавека працы. Гэтаму могуць садзейнічаць, на наш погляд, увага папулярных блогераў, наяўнасць



Фота БелТА.

дакладнай актуальнай інфармацыі аб умовах працы і перспектывах развіцця профільнага сектара эканомікі».

Аб важнасці адукацыйнага, навуковага і інавацыйнага ўзаемадзеяння ВНУ з заказчыкамі кадраў расказаў **рэктар Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. Сухога Артур ПУЦЯТА.** Ён паведаміў, што навучальная ўстанова рыхтуе спецыялістаў па многіх кірунках. «Стратэгічныя планы развіцця рэальнага сектара эканомікі становяцца стратэгічнымі планамі падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў ва ўніверсітэце, — падкрэсліў ён. — Мы не проста ўзаемадзейнічаем з нашымі базавымі прадпрыемствамі — мы рыхтуем кадры разам. Мэта — практыка-арыентаваная падрыхтоўка спецыялістаў ва ўніверсітэце, у рамках якой робіцца акцэнт на практычных навыках і ведах адносна канкрэтных прадпрыемстваў».

Па словах рэктара ВНУ, асобныя практычныя заняткі часта праходзяць непасрэдна на прадпрыемствах, у філіялах, якія выпускаюць кадры ўніверсітэта. «Сёння мы развіваем і зваротную ўзаемасувязь — стварэнне спецыялізаваных навучальных класаў і лабараторый заказчыка кадраў на базе ўніверсітэта, — канкрэтызаваў Артур Пуцята. — Хацеў бы адзначыць эфектыўнае ўзаемадзеянне з такімі арганізацыямі, як «Гомсельмаш», «Гомельэнерга», дзе створаны і функцыянуюць навучальныя аўдыторыі, а студэнты пад кіраўніцтвам вопытных прафесіяналаў-вытворцаў не толькі атрымліваюць практычныя навыкі працы і збіраюць матэрыял для курсавога або дыпломнага праектавання, але і могуць зарабіць свой першы рубель у студэнцкіх атрадах».

**Намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Вольга БУДЗЁНІС** указала на важнасць ідэалагічнага складніка выхавання ва ўмовах выклікаў сучаснага свету. Ад імя педагагічнай супольнасці выступоўца падзякавала Прэзідэнту за яго пастаянную ўвагу да сістэмы выхавання.

«Наша задача — фарміраванне ў студэнтаў гонару за сваю краіну, грамадзянскасці і патрыятызму з дапамогай вучэбнага матэрыялу, форм і метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе, — падкрэсліла Вольга Будзёніс. — Напрыклад, пры правядзенні заняткаў па англійскай мове выкарыстоўваюцца творы беларускіх класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мы бачым, што моладзь шмат часу праводзіць у інтэрнэце, аднак зносіны ў віртуальным свеце не могуць замяніць жывы дыялог з аднагодкамі і выкладчыкамі».

У гэтай сувязі мерапрыемствы накшталт конкурсаў і фестываляў, якія праводзяцца ў сценах ВНУ, аб'ядноўваюць усіх. Напрыклад, у гродзенскім універсітэце для прадукцыйнага ўзаемадзеяння паміж выкладчыкамі, студэнтамі і школьнікамі працуюць школы асветы патрыятычнай, грамадзянска-прававой, эканамічнай, інфармацыйнай накіраванасці. Пасля навучання ў іх студэнты становяцца лідарамі меркаванняў, гатовыя выступаць сярод аднагодкаў, у каледжах і школах. «Гэта своеасаблівы кадравы рэзерв маладых выкладчыкаў і прадстаўнікоў грамадскасці», — рэзюмавала намеснік дэкана.

## «Будучыня — у вашых руках»

Па меркаванні беларускага лідара, ні ў якім разе ў краіне не павінна быць знішчана прафесійна-тэхнічная адукацыя. Інакш, па словах кіраўніка дзяржавы, будуць каласальныя праблемы. Ён засяродзіў увагу на тым, што Беларусь у гэтым у плане выгадна адрозніваецца ад многіх краін на постсавецкай прасторы, што адзначалася ў тым ліку на найвышэйшым узроўні. Па словах Прэзідэнта, у іншых краінах постсавецкай прасторы ўжо адчулі вастрыню праблемы, у той час як для Беларусі яна цалкам вырашальная за кошт захавання найважнейшага звяна ў сістэме адукацыі — сістэмы прафтэхадукацыі. «У нас ёсць база, і мы можам на гэтай базе падрыхтаваць больш рабочых рук, майстроў, прарабаў — гэта найважнейшае звяно», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт пагаджаецца, што для якаснага прафесійна-тэхнічнага навучання варта наладзіць супрацоўніцтва з прадпрыемствамі, будаўнічымі і сельскагаспадарчымі арганізацыямі, каб навучанне ішло непасрэдна на месцах. «Нам трэба вырашыць гэтую праблему, — сказаў ён. — Члены ўрада тут прысутнічаюць. Трэба прыняць рашэнне».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мы гаспадары ў гэтай краіне і мы нікога не павінны баяцца. «Гэта ж улада ў вашых руках, — канкрэтызаваў ён, кажучы аб пэўных асцярогах людзей уваходзіць у тыя ці іншыя выбарчыя камісіі. — Каму вы яе аддаяце? А там Прэзідэнт усё вырашыць... Я не магу за вас вырашыць тое, што вы павінны вырашыць. Таму не трэба нікога баяцца, бо будзеце чарговы раз пад бізуном хадзіць. Будучыня — у вашых руках. Таму бярыце ўладу ў сваёй краіне і дзейнічайце. Мая справа — вас накіраваць і падказаць, а вы — наперад, наперад, наперад».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што цяперашняму пакаленню неабходна вызначаць лёс краіны ў будучыні. «Я бачу, што будзе заўтра, я бачу, што можа быць, — канстатаваў ён. — Нам трэба не проста звярнуць увагу, нам трэба спахапіцца і ўзяцца за нашых дзяцей, каб яны ў школу прыходзілі як у храм, каб у іх дрыжыкі па целе ішлі, як калісьці пасля вайны было, каб яны ўсё гэта шанавалі».

Тым, хто наракае на моладзь, кажучы, што яна нейкая не такая, Прэзідэнт параіў звярнуць увагу на тое, што моладзь такая, якія мы, сучаснае пакаленне. «Наша моладзь разумная для таго, каб зразумець і ўспрымаць тое, што мы гаворым, — перакананы беларускі лідар. — Толькі хлусіць ёй не трэба, што яна такая ідэальная. Трэба ўбіць у галаву нашай моладзі, каб яны разумелі: без працы нічога быць не можа».

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на значную колькасць тых, хто не заняты ў эканоміцы. І гэта ў той час, калі на рынку працы дастаткова прапаноў. У гэтым сэнсе, па словах Прэзідэнта, у Беларусі занадта шмат дэмакратыі: хачу — працую, хачу — не працую. «Я вам хачу прама задаць пытанне: вам што, прыемна, калі вы ўкалваеце, а хтосьці нічога не робіць, жыве лепш за вас? Гэта нармальна, добра?» — пацікавіўся ў прысутных Прэзідэнт і заўважыў, што вырашэнне пытання незанятасці ў эканоміцы залежыць ад многіх з нас.

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на ўзаемасувязь паміж выхаваннем дзяцей у школах, навучаннем і іх наступным лёсам, роляй у жыцці роднай краіны. «Паглядзіце, хто сёння гвалтам крычыць, што ён бедны, жабрак і ў яго чагосьці не хапае, паглядзіце, як ён вучыўся ў школе, — параіў кіраўнік дзяржавы. — Адны небаракі пакутуюць, карачацца, каб атрымаць вышэйшую адукацыю, імкнуцца да чагосьці (проста малайцы!), а ён у школу шалтай-балтай хадзіў, яму напляваць было на настаўніка, дырэктара. Мы павінны прымаць меры».

Звярнуў Аляксандр Лукашэнка ўвагу і на тое, што многія са збеглых, якія з'ехалі з краіны пасля 2020 года, ужо сталі разумець бесперспектыўнасць свайго ўчынку і просяцца назад у Беларусь. Па яго словах, там, за мяжой, яны зразумелі, што нікому не патрэбныя і могуць прэтэндаваць хіба што на нізкакваліфікаваныя працоўныя месцы. Настаўнік, урач, напрыклад, працуе пасудамыйкай. «Хто ім дасць добрыя месцы, лепшыя ў гэтых краінах? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы. — Там сваіх ахвотных хапае».

Па словах Прэзідэнта, тыя, хто з'ехаў з Беларусі, сталі прасіцца дадому. Для вырашэння пытанняў аб магчымасці вяртання створана спецыяльная камісія. «Свае ж людзі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Можа быць, разумнейшымі сталі. Вы ім раскажыце і самі зразумейце: вось на гэтай зямлі вашы карані».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у Беларусі, як і раней, будзе праводзіцца палітыка па падтрыманні дысцыпліны і парадку.

## «Мы павінны захаваць гэтыя землі для нашых дзяцей»

Пасля завяршэння выступленняў Прэзідэнт адказаў на пытанні ўдзельнікаў педагагічнага савета. Адно з іх датычылася прапановы скараціць колькасць прадметаў у выпускных класах. Настаўніца агучыла пытанне школьнікаў, хоць сама прытрымліваецца мадэлі навучання, якая ўжо ўкаранілася.

Па словах беларускага лідара, выпускнік, які выходзіць за парог школы, павінен быць адукаваны па многіх пытаннях. «Чалавек павінен быць па-сапраўднаму адукаваны, — лічыць ён. — Вы гэта пытанне задалі, я яго ўвогуле першы раз чую. Я думаю, у нас няма такой праблемы. А калі яна з'явілася, трэба на корані гэта знішчаць. Наша школа павінна даваць калі ўжо не велізарныя, шырокія спазнанні свету, то дастатковыя для таго, каб жыць у грамадстве і мець зносіны з іншымі».

Падводзячы вынікі Рэспубліканскага педагагічнага савета, Прэзідэнт падкрэсліў, што цяперашняе пакаленне беларусаў павінна зрабіць усё для таго, каб захаваць краіну. «Я вельмі спадзяюся на вас, — заўважыў ён, звяртаючыся да педагагічнай супольнасці. — Толькі настаўнік можа правесці ўнізе тую палітыку, якую я хачу, каб праводзілася. Таму я казаў пра тое, што вы нікога не павінны баяцца. Вы — гаспадары ў гэтай краіне. Як толькі здрыганецеся — усё, заўтра рыхтуйце лапці (бізун нам ужо падрыхтавалі). Таму ні ў якім разе не адступайце, нікога не бойцеся».

Таксама Прэзідэнт папрасіў педагогаў не баяцца звяртацца з праблемамі па вертыкалі ўлады: іх абавязкова падтрымаюць. «Як ніколі важнае пытанне — утрымаць краіну ў руках, — падкрэсліў ён. — Нам ніколі нашы дзеці, унукі не даруюць, калі мы абвалім краіну і кінем яе. Мы павінны захаваць гэтыя землі для нашых дзяцей. Без вас гэта немагчыма. Мы ўжо за гэтыя гады калі не зразумелі, то намацалі тое, што нам трэба, што трэба для нашай краіны. Давайце яе захаваем для нашых дзяцей. Гэта самая галоўная мая просьба. Для таго, каб захаваць, будзьце жорсткімі, жорсткімі калі трэба, у школе, каб адчувалі, што настаўнік — святое».

Напрыканцы мерапрыемства міністр адукацыі ўручыў Прэзідэнту абноўлены вучэбны дапаможнік па філасофіі і новы падручнік гісторыі. Па словах Андрэя Іванца, пасля крытыкі кіраўніка дзяржавы вучэбны дапаможнік па філасофіі быў поўнасцю перапрацаваны. Што датычыцца падручніка па гісторыі, то, па меркаванні кіраўніка ведамства, гэты падручнік павінен стаць узорам. «Мы пастараліся першы такі ўзор зрабіць», — паведаміў міністр адукацыі.

«Гэта сапраўдны падарунак! Дзякуй вам вялікі, не дарма прыйшоў», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Вераніка КАНЮТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ



### Ранняе выяўленне пажараў і алгарытм дзеянняў падчас урагану

Дзяржава прымае ўсе неабходныя меры для таго, каб дзеці знаходзіліся ва ўстановах адукацыі ў бяспецы. Як расказаў **начальнік Цэнтра ўзаемадзеяння з грамадскасцю і СМІ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Максім КЛАЧКО,** за апошнія пяць гадоў ва ўстановах адукацыі зафіксаваны 23 пажары, дзіцячай смяротнасці на іх не дапушчана. "Сёлета наглядна-прафілактычныя мерапрыемствы па лініі пажарнай бяспекі былі праведзены больш як на 2,5 тысячы аб'ектаў агульнай сярэдняй адукацыі, — паведаміў прадстаўнік ратавальнага ведамства. — Дакументамі дзяржаўнага пажарнага нагляду да ўхілення прапанавана больш як 5 тысяч мерапрыемстваў. Установы адукацыі гэтым займаюцца. Такога роду мерапрыемствы пастаянна застаюцца на кантролі органаў дзяржаўнага пажарнага нагляду Міністэрства па надзвычайных сітуацыях".

Па словах Максіма Клачко, актуальным застаецца пытанне абсталявання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі сістэмамі ранняга выяўлення пажару ў поўным аб'ёме. "У краіне 57 аб'ектаў не абсталяваны сістэмай пажарнай сігналізацыі і апавяшчэння людзей аб пажары з перадачай сігналу сістэмай "Маланка", — канкрэтызаваў ён. — У Брэсцкай вобласці — два такія аб'екты, у Віцебскай — дзевяць, у Гомельскай — 45, у Мінскай — адзін".

Зыходзячы з вопыту гэтага лета, калі на краіну нечакана абрынуўся ураган, будзе перагледжаны ўвесь комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі людзей, у тым ліку ў школах і лагерах. "Вопыт стыхіі паказаў, што яна абрушваецца імгненна, — падкрэсліў прадстаўнік ратавальнага ведамства. — Ніхто не чакаў такіх катастрафічных разбурэнняў. Несумненна, будуць зроблены ўсе высновы, каб у будучым гэтыя наступствы выключыць або мінімізаваць".

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нагадаем, у ліпені, калі на большай тэрыторыі краіны разбушаваўся ўраган, у аздараўленчым лагеры імя Марата Казея ў Рэчыцкім раёне загінуў 13-гадовы падлетак. Усяго падчас падзення дрэў пацярпела сямёра выхаванцаў лагера. Усе з іх атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці, адзін з падлеткаў — несумяшчальныя з жыццём. У той час, як надвор'е раптоўна сапсавалася, на канцэртнай пляцоўцы аздараўленчага лагера праходзіла забаўляльнае мерапрыемства.

### Кожны выпадак — рэзанансны

З пачатку года адпачынак на вадаёмах стаў трагічным для 19 сем'яў — менавіта столькі дзяцей не вярнуліся дахаты. Адзін з апошніх няшчасных выпадкаў здарыўся ў Калінкавіцкім раёне. 17 жніўня два сябры сабраліся на рыбалку на раку Ненач. Дахаты яны ўжо не вярнуліся. Як высветлілася, хлопчыкі васьмі і дзесяці гадоў размясціліся на краі пакатага бетоннага насціла. У пэўны момант сябры не ўтрымаліся і з'ехалі ў ваду. Самастойна справіцца са стыхіяй ім не ўдалося.

Жыцці яшчэ семярых дзяцей забраў агонь. Непаўналетнія гінуць у выніку дарожна-транспартных здарэнняў і нават падчас забаў. Трагічны выпадак здарыўся вечарам 11 жніўня на Случчыне. Кампанія дзяцей ва ўзросце ад 10 да 13 гадоў гуляла каля цюкоў з саломай. Як высветлілася, гулялі яны з запалкамі. Рулоны ўспыхнулі імгненна. Самастойна патушыць узгаранне падлеткам не ўдалося, і яны паспяшаліся паведаміць аб здарэнні дарослым, якія і выклікалі супрацоўнікаў МНС. Падчас ліквідацыі пажару ратавальнікі знайшлі 11-гадовага хлопчыка. На жаль, без прыкмет жыцця...

Яшчэ адна дзіцячая забава прывяла да трагедыі ў Столінскім раёне. Недалёка ад вёскі Дубай 11-гадовы хлопчык разам са сваім сябрам на працягу некалькіх дзён гулялі ў пясочным насыпе — капалі тунэль. Днём 1 жніўня сябры працягнулі свой небяспечны занятак, у выніку аднаго з хлопцаў засыпала пяском. Другі падлетак пабег клікаць на дапамогу дарослых. Людзі, якія праходзілі побач,



выцягнулі пацярпелага з пяску. Аднак было ўжо позна: медыкі, якія прыбылі на месца здарэння, канстатавалі смерць дзіцяці.

— Для нас, дарослых, і для ўсіх рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, для міністэрстваў і ведамстваў, якія займаюцца прафілактыкай дзіцячай смяротнасці і траўматызму, кожны выпадак з удзелам дзіцяці, калі яно атрымлівае траўмы або гіне, — рэзанансны, — падкрэслівае начальнік Цэнтра ўзаемадзеяння з грамадскасцю і СМІ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Пытанні бяспекі нашых дзяцей павінны быць пастаянна ў цэнтры ўвагі дарослых. Мы павінны разумець, што дзеці дапытлівыя, імпульсіўныя і цікаўныя. Яны не заўсёды разумеюць магчымыя наступствы сітуацыі, у якой могуць знаходзіцца. Таму наша задача, дарослых, задача нашай дзяржавы — пастаянна быць побач, нагадваць аб гэтых сітуацыях і гаварыць аб бяспецы з дзецьмі. Мы не перастаём інфармаваць усіх грамадзян, што дзеці не шукаюць небяспекі, яны проста гуляюць.

### Па віне дарослых

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях заклікае ўсіх дарослых незалежна ад пары года сачыць і ведаць, дзе, з кім і, галоўнае, з чым гуляе ваша дзіця. "Дзіця давярае больш сваім блізкім, — звяртае ўвагу Максім Клачко. — Таму ад вас, бацькі, пастаянна павінны гучаць напаміны аб тым, што гульні з запалкамі могуць быць небяспечнымі, што на вадаём без дарослых хадзіць катэгарычна забаронена, што гульні на кар'ерах, пясчаных ярах могуць прывесці да трагедыі. Варта не забываць і пра небяспеку для дзяцей, калі яны гуляюць у закінутых будынках".

Гібель дзяцей, а таксама атрыманне непаўналетнімі траўмаў — адказнасць выключна дарослых. Бо, як паказвае практыка, менавіта апошнія, калі здараецца няшчасны выпадак з непаўналетнім, не дагледзелі, не навучылі, не растлумачылі. Нярэдка дарослыя самі становяцца вінаватымі ў сітуацыі, з-за якой непаўналетнія гінуць або атрымліваюць траўму.

У прыватнасці, гібель дзяцей стала наступствам дзеянняў дарослых у вёсцы Каробчына Мсціслаўскага раёна, калі пры пажары загінула чатырохгадовае дзіця. Справа ў тым, што прычынай трагедыі стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні айчыма. У красавіку ў вёсцы Ястрабель Бярозаўскага раёна загінула чацвёра дзяцей! Самаму малодшаму з іх было два месяцы, а старэйшаму — шэсць гадоў. У агні выратаваліся маці і яе чатырохгадовая дачка. Прычына трагедыі — парушэнне правіл эксплуатацыі газавых прылад і агрэгатаў.

### Урокі бяспекі

Напярэдадні навучальнага года ў краіне стартавала інфармацыйна-прапагандысцкая кампанія "У цэнтры ўвагі — дзеці!". Кампанія накіравана на прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблемы траўматызму і гібелі дзяцей ад знешніх прычын, у тым ліку ад пажараў або ў выніку пакідання дзяцей адных, без нагляду дарослых.

Першы этап кампаніі працягнецца да 30 жніўня. Супрацоўнікі МНС у гульнявой форме нагадаюць дзецям і бацькам аб правілах захавання бяспекі ў побыце і аб забароне пакідання дзяцей без нагляду ў месцах, якія спецыялізуюцца на рэалізацыі школьных тавараў. Другі этап пройдзе з 2 да 13 верасня.

"Кампанія будзе праходзіць ва ўстановах першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі, — расказвае **начальнік аддзела сацыякультурнай дзейнасці Рэспубліканскага цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Павел ЧАРНАБУК**. — Мэтавая аўдыторыя — гэта навучэнцы першых — чацвёртых класаў і іх бацькі. Спецыялісты будуць праводзіць урокі бяспекі ў школах, удзельнічаць у бацькоўскіх сходах, дзе будуць таксама даводзіць інфармацыю аб няўхільным захаванні правіл пажарнай бяспекі. Нагадаюць і тое, што нельга пакідаць дзяцей адных, без нагляду".

Дарослыя, прыслухайцеся да парад ратавальнікаў і вучыцеся на чужых памылках. Бо ў бескантрольнасці дзяцей — вельмі высокая цана.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

---

## Будзьце пільныя!

### Наваражыла, дык наваражыла!

#### Мінчанка аддала махлярцы-варажбітцы больш за 59 тысяч рублёў

**Жыхарка сталіцы ўжо не раз звярталася да розных чараўніц ды знахарак па дапамогу ў вырашэнні праблем. Так, летась 55-гадовая жанчына падтрымлівала ў месенджары сувязь з варажбіткай, якая часта «дапамагала» жанчыне парадамі наконт асабістага жыцця. Вядома, кансультацыі былі не бясплатныя.**

У ліпені ж гэтага года жанчыне напісала невядомая і назвалася экстрасенсам. Яна настойліва цікавілася пра здароўе і пра асабістыя справы. Даверлівая мінчанка спалохалася і задала пытанне пра сваю будучыню. Варажбітка адказала, што неадкладна трэба разбірацца з сітуацыяй і ставіць магутную «абарону» ад усіх непрыемнасцяў і напасцяў. І, канешне ж, за пэўны кошт.

Не марнуючы час, мінчанка пачала збіраць грошы. Спачатку яна пераявяла «знахарцы» ўсё, што ў яе было, — больш за 59 тысяч рублёў. «Маг са стажам» пачала «працаваць», але, каб завяршыць ахоўны абрад, сродкаў, па яе словах, недастаткова. Засмучаная жанчына ў пошуках буйной сумы вырашыла падзяліцца сваімі перажываннямі з сынам. Ён і раскрыў мінчанцы вочы — няма ніякай «абароны», а ёсць простае як свет махлярства.

І менавіта па гэтым артыкуле Крымінальнага кодэкса — махлярства, учыненае ў асабліва буйным памеры, — Фрунзенскім (г. Мінска) раённым аддзелам Следчага камітэта ўзбуджана крымінальная справа.

### Заробак сучасны, ашуканства традыцыйнае

#### «Інвестыцыі» ў крыптавалюце ўзбагацілі толькі махляроў

У Першамайскае РУУС сталіцы звярнулася 52-гадовая мінчанка, якая стала ахвярай ашуканцаў. Пацярпелая ў сацыяльнай сетцы ўбачыла прапанову аб інвеставанні ў крыптавалюце. Зацікавіўшыся, яна перайшла па спасылцы ў аб'яве і пакінула свае кантактныя даныя. Праз месенджар з ёй звязаўся «куратар», які даваў указанні аб укладанні сродкаў.

Шэсць месяцаў жанчына па парадах аферыстаў укладвала свае грошы ў «біржу», агульная сума «інвестыцый» склала каля 120 тысяч рублёў. Калі ж яна паспрабавала вывесці грошы, то гэта ў яе, канешне, не атрымалася.



Распачата крымінальная справа па факце махлярства.

### Ізноў праз тэлефон

#### Больш за дзевяць тысяч рублёў перадала пенсіянерка тэлефонным аферыстам

Па дапамогу да праваахоўнікаў звярнулася мінчанка, якая расказала, што яе маці стала ахвярай тэлефонных аферыстаў. На стацыянарны тэлефон пенсіянеркі патэлефанавалі невядомыя і распавялі пра ДТЗ, вінаўнікам якога стала яе дачка. Пажылая жанчына паверыла махлярам. Не патэлефанаваўшы блізкаму чалавеку і не высветліўшы ўсіх абставін, яна паведаміла суразмоўніку па другім канцы провада, што гатова аддаць усе зберажэнні, толькі б дачка пазбегла крымінальнай адказнасці.

Праз некаторы час у яе кватэру пазванілі. Пенсіянерка перадала незнаёмцу і свае, і дачныя зберажэнні — больш за дзевяць тысяч рублёў. Аператыўнікі ўстанавілі асобу падазронага і затрымалі яго. Ім аказаўся 28-гадовы раней судзімы жыхар сталіцы. Ён расказаў, што знайшоў падпрацоўку ў групе месенджара. Грошы, атрыманыя ў пенсіянеркі, фігурант крымінальнай справы паспеў перавесці ашуканцам. Для гэтага на вуліцы мінчанін прапанаваў мінаку за ўзнагароду ў 50 рублёў перавесці сродкі за мяжу.

Простая мова

# СОНЦА НЕ ВЕДАЕ СУМЛЕННЫХ... СОНЦА СВЕЦІЦЬ БЕЗ МЭТЫ НЕКАГА САГРЭЦЬ...

**«Урок» мовазнаўства: у рускай касцюмы, сукенкі, спадніцы, паліто і г. д. аб'яднаныя адным словам «одежда», у беларускай — двума, бо верхняе, цёплае адзенне — гэта ўжо вопратка. I яе — ну вядома ж — лепей апранаць. Надзяваць (ці адзяваць) — адзенне. Адкуль...**

**Зімой, у вялікія маразы ды сцюжы, не ведаеш, што апрануць; летам, у спёку — якраз наадварот — думаеш, што б з сябе скінуць.**

**I ўжо не здзіўляешся таму, што людзі — усіх узростаў: хоць вясковыя, хоць гарадскія — ходзяць у старых парваных шортах, у лінялых майках-сарафанах, у кашулях...**

**У іх — мужчынскіх — можна, дарэчы, паадразаць каўняры (да стойкі) і рукавы (да плечука). На лецішчы, на прыродзе, пры нейкай рабоце гэта самае тое, бо зручна.**

**(Для тых, хто сумняваецца і з розных прычын не можа сабе дазволіць, правіла «20-40-60»: то-бок, у 20 (і менш) нам важна, што пра нас думаюць іншыя, у 40 — не (хай думаюць, што хочуць!), а ў 60 мы ўжо ведаем, што ім, тым іншым, проста не да нас.**

## СЛАБЕЕ ЗРОК

Добра ў вёсцы і летам на лецішчы: ты вітаешся з усімі (знаёмымі, незнаёмымі...), усе вітаюцца з табой і ніякіх думак.

Іншая рэч — у горадзе. Чуеш часам прыветнае: «Вой! Колькі летаў і зім?!», часцяком нават спыняешся, вітаешся з чалавекам, пытаеш, як ён.

А далей (не без таго): дзе вы, што вы?..

Хто вы?

Слабее зрок.

## У КАГО АДВАГА, У ТАГО І ПЕРАВАГА?

Калега некалі на шыкоўны банкет трапіў. Расказваў, чым паілі-кармілі, якая музыка грала, з кім сядзеў за сталом (іх там цікава рассадзілі: абапал сцен, за кожным — па восем чалавек)... Насупраць калегі маладзіца ўладкавалася — у доўгай вечаровай сукенцы з глыбокім дэкальтэ, прычым не столькі спераду, колькі ззаду.

Пад канец ёй слова далі. Жанчына ўстала, спінай і тым самым глыбокім выразам павярнулася да твару свайго суседа, пачала гаварыць.

...Калега расказваў, што спрабаваў неяк, пры дапамозе жэстаў трошкі «адсунуць» яе ці хоць бы «павярнуць»! Жанчына, як і варта было чакаць, ні на што не зважала, у адрозненне ад суседа.

А ўжо ён уважліва агледзеў прыгожую спінку ды ўсё, што ніжэй, усміхнуўся і прызнаў, што так вось — таксама добра.

...Гэта я да таго, што днямі наш аўтобус маладую веласіпедыстку дагнаў. І не ў нейкіх там прывычных штоніках ці шортах — у даўгаватай, белай, сукенцы, зверху зашпіленай на гузікі. А вось знізу...

На веласіпедзе ў такой, відаць, не вельмі зручна, мо нават небяспечна, асабліва ў сталіцы, дзе столькі руху? Але што адметна — факт.

(Японская прымаўка: любая жанчына здаецца прыгожай у цемры, здалёку і пад папяровым парасончыкам.)

## БАЧУ МЭТУ — НЕ БАЧУ ПЕРАШКОД?

...Жанчына вечарком пайшла ў краму па хлеб. Бачыць: каля ўвахода, на лавачцы, мужчына спіць. Пашкадавала, што міліцыя замяце. Ды і мулка ж чалавеку, нязручна. «Зараз, — падумала, — хлеба куплю і забяру з сабой. Адзенне яго адмыю, пачакаю, пакуль праспіцца, пакармлю, а там...»

Схадзіла ў краму, узяла хлеба, выйшла на вуліцу, — лаўка пустая. «Во дурніца, — сказала сама пра сябе, — нібы з паўгода хлеба не ела!»

Гэта быў анекдот, зараз — чыстая праўда.

Вечар, прыпынак, народу вобмаль і трамвая доўга няма — усіх паспелі разгледзець. А найбольш — невялічкую зграбную жанчынку гадоў 40, у якой, здаецца, прыгожае ўсё: і твар, і адзенне, і душа...

Мы разам зайшлі ў паўпусты вагон, селі. Яна, праўда, не ўзялася нешта чытаць і таму раней заўважыла, што ў трамвай зайшоў высокі п'яны мужчына, павіс на парэнчы, пагрозліва загайдаўся...

— Ой, вам цяжка стаяць? — падхапілася прыгажуня. — Ідзіце сюды! Сядайце.

Мужчына сеў, дастаў цыгарэты, закурыў (у кулак, жанчына прасачыла, каб не зайшла міліцыя ці кантралёры), потым уздоўж сядзенняў выцягнуў свае доўгія ногі, прываліўся да акна, заплюшчыў вочы.

— Гэта правільна. Трэба паспаць, — пахваліла яго прыгажуня. — Але ж скажыце, дзе вам выходзіць? Я пабуджу, а то...

Мужчына не даслухаў — адмахнуўся, заснуў.

Жанчына засталася стаяць і, што называецца, «над душой»: цяпер яна сачыла, каб ніхто, бронь божа, не зачапіўся за ногі ў праходзе, каб не пабудзіў п'янага раней.

...Прыпынкаў праз 10—15 — у іншым канцы маршрута — мы з тога трамвая выйшлі, пара (?!) паехала далей. Да яе? Да яго? Кожны да сябе? Пытанне.

Алесь Адамовіч пісаў, што ў гады вайны жанчыны збіраліся па пяць, па дзесяць чалавек і — у нядзеі знайсці сваіх мужоў — лёталі, качавалі ад аднаго лагера ваеннапалонных да другога, часам за сто, за дзвесце вёрст.

Здаралася, знаходзілі, выкуплялі...

Даслоўна: «Хіба нешта спыніць бабу, калі ёй засвеціць хаця б маленькая надзея».

## ПЕРШ ЧЫМ ЗРАБІЦЬ, ПАДУМАЙ...

Майстры сыходзяць — карціны застаюцца.

Янка Брыль (светлай памяці) ці не адным сваім сказам сабачку «намаляваў». Той маленькі быў, але ж вельмі фанабэрысты: хацеў з шыкам ды размахам нокку на кусцік задраць і... перакуліўся.

Грэх мо праводзіць паралель, аднак Пятровіч таксама замахваўся: расказвалі, шыльду аднекуль прывёз, на дзвярах у сваім кабінеце прымацаваў кідкае: «Перш чым зайсці, падумай, ці патрэбен ты тут».

Дні са тры гэты надпіс вісеў, пакуль вышэйшае начальства не згледзела. Загадалі зняць. Праўда, не выкінуць.

...Перад выхадам на пенсію Пятровіч дом у вёсцы купіў, не паспеў пераехаць — надпіс прыбіў. Нехта з вяскоўцаў прачытаў, іншым расказаў — разам пасмяяліся: не патрэбныя мы табе, дык ты нам — стакроць. Да навасёлаў ніхто не пайшоў, хоць ім пасля і хацелася. Гаспадыня, жонка



Валянцін ГУБАРАЎ «Вялікія мары».

Пятровіча, стала хварэць, з ложка амаль не ўставала: рада была б, каб нехта дзверы адчыніў, зайшоў, пагутарыў...

Пятровіч нават папярэджанне зняў!

І тым самым нічога не змяніў: вёска яго жонку хіба на могілкі правяла.

Удавец цяпер жыве адзін. Ледзь не кожны дзень то ў краму ідзе, то на пошту ці ФАП, перайме людзей, загаворвае...

Тыя, вядома ж, не адштурхоўваюць. І не сказаць, што прымаюць.

...Аўгусцін Аўрэлій: «Калі падымаецца вада, рыбы ядуць мурашак, калі вада сыходзіць — мурашкі ядуць рыб. Хай ніхто не разлічвае на сваю сённяшнюю перавагу.

## АД СЛОВА «СУМ»?

У Дзянісаўны сынок толькі адзін (і тое быў!), затое ўнукаў — трое!

Ганарылася бабуля, верыла, што пасля яе смерці нехта з іх паселіцца ў яе невялічкай цёплай хаце (за 15 кіламетраў ад горада), нехта будзе гаспадарыць на 20 сотках дагледжанай зямлі, карыстацца садам, склепам, студняй...

Аж не тут тое было: у старэйшага ўнука жонка з дачай, у сярэдняга — цешча ў вёсцы, а ўнучцы (вось неспадзяванка!) пагулялі бы, выпіць, пакурыць...

Бабуліны сцежкі, сад і гарод зарастаюць травой — у жніўні — жоўценькай-жоўтай! Па-руску яе так і завуць «золотарник», па-беларуску — сумнік.

## АДНА БЯДА НЕ ХОДЗІЦЬ

Пятніца. Метро. На чарговай станцыі — два новыя пасажыры. Дыялог — ля самага вуха:

— Ты заўтра з намі паедзеш?

— Не... Да цешчы трэба.

— Чаго?! Ты ж нядаўна быў.

— Дах у яе сарвала.

— Ты ж казаў, ён даўно ўжо... Таго...

— Так. Але ж цяпер — канкрэтна: нейкая бура прайшла — шыфер знесла.

— Ну-у, тады трэба ехаць.

## НОВЫ РАДОК?

Раніца. Прыпынак. У чаканні патрэбнага трамвая прапускаем іншыя — з кідкім надпісам «Оплати».

Яно, гэта слова, мільгае перад вачыма і раз, і два, і тры... Пасля чаго першая літарка чамусьці аддзяляецца ад астатніх, прапанова аплаціць праезд пачынае гучаць як загад: плаці, ну вядома ж, у трамваі — за паездку, у краме — за прадукты, у аптэцы — за лекі, на пошце — за кватэру...

— Плаці ды плаці, — абураецца побач пенсіянерка са стажам. — Дзе ж таго плаціла набрацца?!

...Радок з тлумачальнага слоўніка беларускай мовы: «Купіла — сродкі, грошы, за якія купляюць што-небудзь».

Слова «плаціла» сярод сінонімаў пакуль няма.

## СЯРОД ЛЮДЗЕЙ

Горад. Аўтобус. Пасажыраў вобмаль — можа, з дзясятак, але ж гэту маладзіцу ўбачыў бы сярод ста, бо яна — піла (на твары напісана), піла доўга і, мусіць, па-чорнаму. Але ж здарыўся нейкі цуд: спынілася, «завязала», вяртаецца да жыцця! Цяпер во — прысценька, але з густам прыбралася, акуратна прычасалася, села — некуды едзе. І пры гэтым, як дзіця, здзіўлена пазірае — то на шумны праспект, што гудзе за вокнамі, то на людзей, што стаяць паблізу і ўжо не круцяць насамі, не грэбуюць ёй.

Дык яна ж з удзячнасці, з любасці да іх (зноў жа — на твары напісана) што заўгодна можа зрабіць! А найперш і вось тут — пасунуцца, сказаць — хоць каму:

— Сядайце!

...І кароткае «Дзякуй» і «Не хачу» яна, відаць, зразумела б, бо ў аўтобусе месцаў — хоць адбаўляй.

Але слоў не было. Мужчына (яе гадоў... А ўжо ж інтэлігентны, прыгожы!) проста... сеў. Поруч!

Твар жанчыны — ссінелы — заліўся прыгожай чырванню, на вачах праступілі слёзы — слёзы радасці, слёзы гонару — за сябе. За людзей — добрых?

Розных.

## АЛЕ...

Чыстая праўда: той, хто ўмее чытаць, ніколі не навядзе парадак на сваім гарышчы.

На нашым, сярод безлічы папер, пажоўклы газетны лісток без пачатку і канца — нечыя ўспаміны пра Сухамлінскага, ягоныя ўрокі. Ну, у прыватнасці, для таго, каб растлумачыць сваім вучням розніцу паміж фашыстамі і антыфашыстамі, звычайнымі немцамі, ён распавядаў, як адзін з іх праз тры гады пасля вайны прыехаў у Савецкі Саюз, як наведаў фабрыкі і заводы, як папрасіўся ў школу...

Дзеля гэтага дзяцей з кветкамі сабралі ў двары, і ўсе, калі госць наблізіўся, сталі вітаць яго — апладзіраваць.

Не рабіла гэтага толькі адна дзяўчынка: праз яе мястэчка праходзіў фронт, яны з мамай уцякалі ад немцаў, нехта з іх кінуў гранату. Мама загінула, дзяўчынка засталася без рук.

Убачыўшы гэта, госць падышоў да яе, апусціўся на калені, узяў рукамі яе кульцю, пацалаваў і сказаў (цішыня стаяла такая, што пачулі ўсе): «Даруй, дзяўчыначка... Пакалечылі цябе фашысты, не вінаваты нямецкі народ».

Паводле заўвагі аўтара, Сухамлінскі ў гэтым расповедзе пакінуў загадку: адна літарка ў словах госця чытаецца дваяка: не тое «не виновен немецкий народ», не тое «но виновен...».

З Лідзіі Арабей: «Кожная вайна рана ці позна канчаецца мірам. Але не ўваскрэснуць мільёны юнакоў і мужчын, якіх увабрала ў сябе зямля і якія маглі б, магчыма, нарадзіць геніяў».

**Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж з упадабанага японская прымаўка:***

Сонца не ведае сумленных. Сонца не ведае несумленных. Сонца свеціць без мэты некага сагрэць. Той, хто знайшоў сябе, падобны да сонца.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

28 жніўня 2024 г. № 32 (765)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

Прыярытэты нашай дэлегацыі на II Узбекска-беларускім жаночым бізнес-форуме

# ЖАНЧЫНЫ, БІЗНЕС І «ЗЯЛЁНАЯ»ЭКАНОМІКА








**Ва Узбекістане прайшоў II Узбекска-беларускі жаночы бізнес-форум. Практыка правядзення падобнага мерапрыемства была распачата летась у Мінску. І, як паказалі яго вынікі, гэта мерапрыемства мае ўсе шанцы не толькі стаць плённай традыцыяй супрацоўніцтва дзвюх краін, але і пашырыць сваю геаграфію. Летась падпісана 14 мемарандумаў і пагадненняў аб супрацоўніцтве, уключаючы пагадненне аб стварэнні сумеснай гарбарна-абутковай вытворчасці, заключана 15 кантрактаў на больш як Br90 млн, або 350 млрд узбекскіх сумаў.**

**Сёлета прадстаўнічая беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ накіравалася ў Ташкент. Ад беларускага боку ў форуме прынялі ўдзел каля 100 прадстаўнікоў бізнес-супольнасці і дзяржаўных органаў. У першы дзень форуму было арганізавана шэсць тэматычных секцый зыходзячы з асноўных кірункаў супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана: машынабудаванне, лёгкая прамысловасць, сельская гаспадарка, хімія і дрэваапрацоўка, медыцынскія і адукацыйныя паслугі, турызм. Асноўная мэта секцыйных пасяджэнняў — прадэманстраваць эканамічны патэнцыял Беларусі, зацікавіць ва ўстанаўленні новых кантактаў.**

Учора адбылося пленарнае пасяджэнне. А перад ім Наталля Качанава сустрэлася са старшынёй Сената Олій Мажліса Танзілай Нарбаевай. У сустрэчы таксама прынялі ўдзел члены парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь, члены груп дружбы Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан.

Вынікам сустрэчы стала падпісанне Плана практычных мер (дарожнай карты) па рэалізацыі Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Сенатам Олій Мажліса Узбекістана.

Выступаючы на пленарным пасяджэнні II Узбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму, Наталля Качанава падкрэсліла: «Беларусь і Узбекістан трывала звязаны сувяззю дружбы і брацтва. Нас аб'ядноўваюць агульная гісторыя, узаемавыгаднае гандлёва-эканамічнае партнёрства, цесныя культурныя і гуманітарныя сувязі. А галоўнае — роднасць душ беларусаў і ўзбекаў, наша цвёрдае імкненне жыць па сваіх законах і спрадвечных традыцыях, развіваць нацыянальную ідэнтычнасць і заўсёды ісці ўласным шляхам. Дасягнуты высокі ўзровень двухбаковых адносін — перш за ўсё заслуга кіраўнікоў нашых дзяржаў. Падпісанне ў лютым бягучага года ў ходзе афіцыйнага візіту беларускага лідара ў Рэспубліку Узбекістан Плана па развіцці супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі на 2024—2025 гады і шэрагу іншых важных двухбаковых дакументаў дасць магчымасць вывесці міждзяржаўнае супрацоўніцтва на якасна новы, стратэгічны ўзровень».

### Высокі ўзровень

У рамках афіцыйнага візіту беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай сустрэлася з прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым.

Бакі разгледзелі пытанні далейшага паглыблення шматпланавых адносін паміж Узбекістанам і Беларуссю, у тым ліку пашырэнне міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. У час размовы яны высока ацанілі плённыя вынікі сумесных мерапрыемстваў па лініі парламентаў, якія прайшлі гэтымі днямі ў Ташкенце, у тым ліку сустрэч у Олій Мажлісе Узбекістана і ў рамках II Узбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму. Акрамя таго, была падкрэслена важнасць прадаўжэння інтэнсіўнага міжпарламенцкага дыялогу, накіраванага на прасоўванне канкрэтных праектаў супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў сферах гандлю, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, адукацыі, аховы здароўя і іншых прыярытэтных кірунках.



Фота sb.by.

«Без сумнення, беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум цалкам адпавядае духу часу, спрыяе ўвасабленню ў жыццё дасягнутых нашымі кіраўнікамі дамоўленасцяў і выпрацоўцы новых напрамкаў узаемадзеяння дзвюх краін. Гэты ўнікальны фармат супрацоўніцтва гарманічна спалучае надзённыя інтарэсы бізнесу, грамадства і дзяржавы і мае ўсе шанцы перарасці ў магутныя міжпарламенцкі, міждзяржаўныя і міжрэгіянальныя жаночы рух», — сказала Наталля Качанава.

«І яшчэ больш значна тое, што паміж жанчынамі-парламентарыямі, кіраўнікамі, прадпрымальнікамі, ключавымі грамадскімі аб'яднаннямі і маладзёжнымі структурамі выбудоўваюцца надзейныя дзелавыя сувязі і проста добрыя сяброўскія адносіны, якія фарміруюць фундамент для далейшага стратэгічнага супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана. Упэўнена: дасягнутыя вынікі — далёка не мяжа нашых магчымасцяў, — падкрэсліла спікер. — Наперадзе ў нас — сур'ёзныя перспектывы».

«Непераходзячыя важнасць і актуальнасць тэмы цяперашняга форуму «Ад традыцыйнага бізнесу да зялёнага бізнесу» відавочныя. Пры гэтым у адрозненне ад маючых месца ў некаторых дзяржавах і аб'яднаннях пустога папулізму, выкарыстання экалагічных механізмаў для выціскання эканамічных канкурэнтаў і стрымлівання іх развіцця, аказання палітычнага ціску на непажаданых, Беларусь і Узбекістан падыходзяць да пытання будаўніцтва эканомікі зялёнага тыпу добрасумленна і адказна, падмацоўваючы гэта рэальнымі справамі і ўзятымі на сябе абавязацельствамі.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Фарміраванне бюджэту, інвестпраекты, дапамога дзецям

Што было ў цэнтры ўвагі сенатараў на мінулым тыдні

● Пад старшынствам Уладзіслава Татарыновіча адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Удзел у пасяджэнні прынялі таксама старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Васіль Панасюк, намеснік міністра фінансаў Дзмітрый Кійко і Алена Печань, а таксама намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Андрэй Лабовіч. Былі разгледжаны падыходы да фарміравання праекта рэспубліканскага бюджэту на 2025 год і змянення падатковага заканадаўства. Падводзячы вынікі абмеркавання, Уладзіслаў Татарыновіч падкрэсліў, што праект рэспубліканскага бюджэту на 2025 год захаваў сацыяльную накіраванасць, а прапанаваныя змяненні падатковага заканадаўства нацэлены на дасягненне аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, не дапускаючы пры гэтым зніжэння аб'ёму бюджэтных даходаў.

● Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны інжынер — першы намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Магілёўхімвалакно» Канстанцін Сіроцін прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі пачатку ўзвядзення комплексу бесперапыннай вытворчасці кампанентаў для адбельвання прадуктаў з цэлюлозы, якая прайшла на яго прадпрыемстве. «Гэты праект абсалютна новы для нас, ён не звязаны з нашай традыцыйнай прадукцыяй, якую мы выпускаем, — адзначыў сенатар. — Гэта поўнасцю імпартазамяшчальны праект, такія прадукты ў Рэспубліцы Беларусь раней не выпускаліся». Парламентарый таксама дадаў, што ўсе папярэднія і кантрактныя працэдуры ўжо завершаны, і выказаў упэўненасць у поспеху праекта.

● Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар ДУ мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой» Аляксандр Каркатадзэ прыняў удзел у IV фестывалі ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Непакорная цвярдыня», прысвечаны падзеям перыяду Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі. «Рэканструкцыя, якая адбылася, — гэта даніна нашай памяці героям Першай сусветнай вайны, абаронцам Айчыны, якія і сёння вучаць нас любіць сваю Радзіму, а калі спатрэбіцца, то і абараніць яе свабоду і незалежнасць. Памяць аб подзвігу герояў Першай сусветнай вайны павінна перадавацца з пакалення ў пакаленне», — падкрэсліў парламентарый.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар ААТ «Камінтэрн» Ксенія Панцюхова прыняла ўдзел у дабрачыннай акцыі «Заўтра ў школу» і ўручыла падарункі выхаванцам Калінкавіцкага дзіцячага сацыяльнага прытулку і дамоў сацыяльнага тыпу. Дзеці атрымалі ад сенатара камплекты школьнай формы. «Помніце, добрая вучоба — ваш білет у будучыню. Ніколі не апускайце рукі і вучыцеся шукаць у любой складанасці магчымасці. Будзьце тарасімі, пазітыўнымі, упэўненымі ў сабе, стаўце мэты і дамагайцеся іх», — пажадала парламентарый.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ЖАНЧЫНЫ, БІЗНЕС І «ЗЯЛЁНАЯ» ЭКАНОМІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Па гэтым кірунку супрацоўніцтва нашы краіны маюць невымерныя рэзервы — нам ёсць над чым працаваць і да чаго імкнуцца», — расказала Наталля Качанава. Спікер прапанавала сфарміраваць спецыяльную рабочую групу, якая падрыхтуе аналіз дзейных у дзвюх краінах палітыка-праграмных дакументаў і прапануе адпаведны план сумесных мерапрыемстваў па кірунках развіцця зялёнага бізнесу, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Прагучала таксама прапанова, каб народжаныя на палях форуму бізнес-праекты ўзяць пад куратарства парламентарыяў дзвюх краін.

Наталля Качанава прапанавала ўзбекскім калегам-сенатарам пашырыць геаграфію форуму — выступіць з ініцыятывай аб правядзенні жаночага бізнес-форуму ШАС.

«Такія фарматы, як наш жаночы бізнес-форум, павінны маштабавацца на міжнародны ўзровень перш за ўсё як канал жаночай мудрай дыпламатыі, які мае вялікі патэнцыял у перагаворных працэсах, пасрэдніцтве і мірным урэгуляванні, — адзначыла яна. — Голас нашых жанчын павінен гучаць больш упэўнена і ярка. Нам трэба займаць больш актыўную пазіцыю па кансалідацыі сусветнай жаночай грамадскасці, бо толькі разам можна абараніць адзіную і непадзельную бяспеку, забяспечыць усеагульнае ўстойлівае развіццё, гарантаваць незваротнасць больш збалансаванага і справядлівага светаўладкавання».

**Паводле БелТА.**

### У тэму

Беларусь і Узбекістан пацвярджаюць узаемную цікавасць да развіцця двухбаковага супрацоўніцтва па ўсіх кірунках. Аб гэтым заявіў **міністр эканомікі Беларусі Юрый ЧАБАТАР** на палях II Узбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму. «У першы дзень мы папрацавалі на секцыях па розных кірунках: ад рэальнага сектара, машынабудавання да сфер турызму, аховы здароўя. Адбыўся абмен вопытам. У нашых калег з Узбекістана ёсць што пераймаць, — адзначыў Юрый Чабатар. — Мы таксама ўнеслі свае прапановы па пытаннях навучання ўзбекскіх рабят у Беларусі, развіцця рэальнага сектара эканомікі, машынабудавання. Узбекістан упэўнена па гэтым шляху ідзе, прыцягваючы адпаведныя інвестыцыі ў вытворчасць лёгкага і грузавога аўтатранспарту.

Міністр дадаў, што цяпер нарастае інвестыцыйны парадак дня. «Беларусь укладваецца ў развіццё Узбекістана кратна за апошнія пяць гадоў. І ўзбекскія прадпрыемствы ўкладваюцца ў эканоміку Беларусі. Толькі тут ва Узбекістане каля 180 арганізацый з капіталам з Беларусі. Гэта пацвярджае цікавасць нашага двухбаковага супрацоўніцтва, — заявіў ён. — Калі ёсць сумесныя прадпрыемствы — гэта залог поспеху. Калі ёсць уласны капітал, прадпрыемствы развіваюцца і нацэлены на ўзаемны тавараабарот».

### Дарэчы

У Беларусі 40 працэнтаў прадпрымальнікаў — жанчыны. Пра гэта расказаў **першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай СНАПКОЎ**, які таксама прымаў удзел у II Узбекска-беларускім жаночым бізнес-форуме.

Ва ўмовах эканамічнай нявызначанасці і глабальнай турбулентнасці роля жанчын у эканоміцы кіраванні набывае асаблівую значнасць, адзначыў Мікалай Снапкоў. «Роля жанчыны, перш за ўсё ў эканоміцы і грамадскім жыцці, выдатная. Жанчыны больш грамадска актыўныя, а значыць, ад пачатку больш сацыяльна адказныя», — падкрэсліў ён. Многія ўзначаленыя жанчынамі прадпрыемствы пабудаваны на прынцыпах экалагічнасці і сацыяльнай роўнасці. Па шэрагу даследаванняў, 45 працэнтаў жанчын-інвестараў схільныя ўкладваць сродкі, «каб зрабіць свет лепшым», — гэта амаль удвая больш, чым у мужчын, дадаў Мікалай Снапкоў.

МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА

# Вынікі работы і парады на перспектыву

## Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла з маладымі парламентарыямі, якія завяршаюць свае паўнамоцтвы

**Маладзёжны савет (парламент) другога склікання пры Нацыянальным сходзе заканчвае сваю двухгадовую работу. У заключным пасяджэнні маладых парламентарыяў удзельнічала Старшыня Савета Рэспублікі. Спікер падзякавала хлопцам і дзяўчатам за зробленае, найбольш актыўным і ініцыятыўным уручыла падзякі, дала каштоўныя парады на будучыню, якія абавязкова спатрэбяцца маладым людзям на іншых, не менш адказных, участках работы.**


Фота БелТА.

### Кадравы рэзерв і будучыня краіны

Маладзёжны савет быў створаны ў ліпені 2020 года. Гэта кансультатыўна-дарадчы орган, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на грамадскіх пачатках. Яго мэта — садзейнічанне дзейнасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у галіне заканадаўчага рэгулявання правоў і законных інтарэсаў моладзі. У склад Маладзёжнага парламента ўваходзяць маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 31 года, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Тэрмін паўнамоцтваў кансультатыўна-дарадчага органа — два гады.

За перыяд сваіх паўнамоцтваў маладыя парламентарыі другога склікання ўзялі ўдзел у больш як 300 асабістых прыёмах грамадзян і 200 прамых тэлефонных лініях членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, гарадскіх, абласных і раённых саветаў дэпутатаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Яны — актыўныя ўдзельнікі пасяджэнняў Савета Рэспублікі, сумесных пасяджэнняў палат парламента, пасяджэнняў гарадскіх, абласных і раённых Саветаў дэпутатаў.

За два гады члены Маладзёжнага савета другога склікання арганізавалі звыш 1,8 тысячы мерапрыемстваў, а таксама ўдзельнічалі больш як у 3 тысячах мерапрыемстваў. За гэты час маладыя парламентарыі былі актыўныя, не баяліся агучваць сваю пазіцыю ў сродках масавай інфармацыі, на іншых пляцоўках. На гэта звярнула ўвагу і Старшыня Савета Рэспублікі.

«Вы ўступаеце ў дыялог, дэбаты, адстойваючы свой пункт гледжання, і гэта добра, — звяртаючыся да маладых парламентарыяў, дала станоўчую ацэнку іх дзейнасці спікер. — Думаю, што той вопыт, які вы атрымалі, спатрэбіцца вам у далейшай рабоце. Вы — кадравы рэзерв тых, хто можа прыйсці працаваць у дзяржаўную службу, хто можа працаваць у грамадскіх арганізацыях. Сёлета мы правялі адзіны дзень галасавання, і, я лічу, вы павінны ўдзельнічаць у такіх кампаніях. Калі вам гэта цікава, трэба працаваць у мясцовых Саветах дэпутатаў. Вы для гэтага прыйшлі ў Маладзёжны савет — набрацца вопыту і прасоўваць сваю работу, у тым ліку і ў гэтым кірунку».

Аднак, па словах спікера, хлопцам і дзяўчатам, якія прайшлі школу маладзёжнага парламентарызму, трэба рухацца наперад, перадаваць вопыт, атрыманы падчас работы ў Маладзёжным савеце, далей працягваць прасоўваць дзяржаўную палітыку.

«У нашай краіне можна і трэба ствараць сем'і, нараджаць і выхоўваць дзяцей, думаць пра будучыню, бо гэта бачыцца перспектыўным, — канстатавала Наталля Качанава. — Прыводзіць прыклады таго, што адбываецца ў свеце, мне вам не трэба, бо вы гэта бачыце. Там, дзе некалі былі квітнеючыя краіны, сёння — руіны. Нам гэтага дапусціць нельга. Для гэтага кожны павінен падумаць: а што я зрабіў для сваёй краіны? І мы гэта робім».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што ў аснове палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне, — людзі. «Трэба ўмець працаваць з людзьмі, людзей трэба любіць, — падкрэсліла яна. — Калі ты любіш людзей, то будзеш рабіць усё для таго, ім было добра». Спікер пажадала маладым людзям рухацца наперад і памятаць, што час вельмі няпросты, калі будучыня залежыць ад кожнага з нас. «І правільна сказаў наш Прэзідэнт: час выбраў нас. Калі заўтра прыйдзецца стаць на абарону нашай краіны — станем усе разам і будзем абараняць».

### Прапановы — дзелавыя і канструктыўныя

У размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што яна ўдзячная хлопцам і дзяўчатам, якія завяршаюць дзейнасць у Маладзёжным савеце, за іх неабыякавасць, патрыятычныя адносіны да сваёй краіны, за тую работу, якую яны праводзілі на працягу двух гадоў. «Упэўнена, што яны перададуць свае веды і вопыт тым, хто прыйдзе і будзе працаваць у трэцім скліканні, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Якія б мерапрыемствы мы ні праводзілі — прыёмы па асабістых пытаннях, пасяджэнні сесіі, Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, — хлопцы і дзяўчаты заўсёды прымалі ў іх удзел. Іх дапытлівасць, жаданне ўбачыць, як нараджаецца законапраект, як члены Савета Рэспублікі працуюць з людзьмі, неабыякавасць гэтых маладых людзей — залог будучыні нашай краіны. Вельмі хачу, каб у іх усё атрымалася. Дакладна ведаю, што гэта добры кадравы патэнцыял для нашай краіны, нашых рэгіёнаў».

Па словах спікера, за два гады работы маладымі парламентарыямі зроблена вельмі шмат. «Прапановы, якія паступалі ад хлопцаў і дзяўчат, — дзелавыя, канструктыўныя, мы выкарыстоўвалі іх у сваёй рабоце, — удакладніла яна. — У нас склалася выдатная ўзаемадзеянне, і я вельмі разлічваю, што тыя хлопцы і дзяўчаты, якія прыйдуць і будуць працаваць у новым скліканні, роўна так паставяцца да нашай краіны, будуць сапраўднымі патрыётамі, аддаdanымі свайму народу і нашай любімай Беларусі».

### Голас моладзі

Наталля Качанава прапанавала маладым парламентарыям падключацца да абмеркавання змяненняў і дапаўненняў у заканадаўства аб крымінальнай адказнасці, над чым цяпер актыўна працуюць члены Савета Рэспублікі.

«Прэзідэнт даручыў правесці шырокае абмеркаванне з грамадзянамі, — паведаміла спікер. — Я папрасіла наш Маладзёжны савет, каб яны ўключыліся ў работу з моладдзю па ўнясенні дапаўненняў і змяненняў у гэтыя важныя заканадаўчыя акты. Мы бачым, што сёння шмат негатыўных праяў накіравана на моладзь. Гэта спажыванне наркотыкаў, шматлікія ашуканскія схемы, у якія ўцягваюць нават непаўналетніх — не грэбуюць нічым. Зусім яшчэ дзеці трапляюць у гэтыя пасткі, у выніку даводзіцца іх прыцягваць да крымінальнай адказнасці за распаўсюджванне наркотыкаў, а гэта вельмі сур'ёзны артыкул. Гэта найцяжэйшыя віды злачынстваў. Таму няхай моладзь сёння пагаворыць пра гэта, абмяркуе. Мы хочам пачуць, як яны лічаць, што сёння трэба яшчэ зрабіць для таго, каб спыніць гэтае зло, каб маладыя людзі не ўцягваліся ў гэта».

Першае пасяджэнне Маладзёжнага парламента трэцяга склікання пры Нацыянальным сходзе запланавана на другую палову верасня. Як паведаміў **старшыня Маладзёжнага савета другога склікання Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ**, на ім будуць выбраны прэзідыум, старшыня, намеснікі, старшыні камісій. «Вельмі важна, што будзе забяспечана пераемнасць, — падкрэсліў ён. — З ліку членаў Маладзёжнага савета другога склікання ў новы склад мясцовымі органамі ўлады дэлегавана дзевяць чалавек».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ВЯРТАЦЬ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ТАЛАКІ

**Прайшло ледзь не паўгода, як старшынёй Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў абраны Ігар БРЫЛЕВІЧ. Сённяшняя наша гутарка з членам Савета Рэспублікі, кіраўніком абласнога прадстаўнічага органа ўлады — аб рабоце дэпутатаў усіх узроўняў, аб ініцыятывах, якія становяцца рэальнымі справамі на месцах, аб практыцы выязных сесій і прэзідыумаў, аб асаблівасцях работы з насельніцтвам і не толькі.**



***— Ведаю, што вы, Ігар Максімавіч, пачыналі сваю работу ў якасці старшыні абсалютна з наведвання раёнаў, знаёмства з раённымі і сельскімі Саветамі. Якія ўражанні ад паездак, сустрэч з дэпутацкім корпусам на месцах?***

— Сапраўды, стараюся болей бываць на месцах, сустракацца з людзьмі. На гэты раз у нас даволі значна памянялася кіруючае звяно і раённага, і пярвічнага ўзроўняў прадстаўнічай улады. І хоць па ранейшай рабоце я няблага ведаю многія раёны вобласці, цяперашняе знаёмства адбываецца на новым узроўні. У камандзіроўках пачынаю з сустрэч з дэпутатамі райсаветаў, па магчымасці разам са старшынёй раённага Савета наведваем сельсаветы, дзе звяртаем увагу як на станоўчы вопыт, так і на праблемы развіцця тэрыторый. Стараюся прысутнічаць на пасяджэннях райвыканкамаў, каб ведаць і ацэньваць сітуацыю ў кожным раёне.

***— Якія высновы зроблены з першых паездак? Што ўсяляе аптымізм, на што можна і трэба абапірацца ў далейшай рабоце?***

— Аптымізм усяляюць тыя справы і пачынанні, якія сведчаць пра нераўнадушнасць людзей, пра іх жаданне палепшыць свой горад альбо сваю вёску. Маю на ўвазе найперш рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў. Насамрэч гэтых ініцыятыў вельмі многа, не заўсёды мы і ведаем пра іх, бо людзі пэўным чынам не афармляюць альбо не заяўляюць пра іх. Скажам, выйшлі пяць чалавек з суседніх дамоў і засыпалі праблемны ўчастак дарогі альбо сабраліся на невялікі суботнік і пасадзілі дрэвы насупраць сваіх двароў. Гэта і ёсць рэалізаваная ініцыятыва. Але часцей грамадзяне арганізоўваюцца з дапамогай мясцовай улады і вырашаюць канкрэтнае пытанне. Трэба імкнуцца, каб такіх пачынанняў было больш, каб як мага больш людзей уцягвалася ў добрыя справы. Для гэтага і праводзяцца конкурсы.

Нядаўна былі падведзены вынікі аднаго з іх, арганізаванага абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў. Дарэчы, Законам «Аб мясцовым самакіраванні», які нядаўна быў дапоўнены адпаведным артыкулам, прадугледжаны ў тым ліку парадак суфінансавання грамадзянскіх ініцыятыў з бюджэту і сродкаў грамадзян. Трэба сказаць, што раёны праявілі сябе даволі актыўна.

***— Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна пра вынікі конкурсу і цікавыя ініцыятывы, якія ўжо рэалізаваны ў вобласці.***

— Сёлета на конкурс было прадстаўлена дзесяць ініцыятыў. Жыхары рэгіёна прапаноўваюць устанавіць новыя манументы для захавання гістарычнай памяці, ініцыіруюць павелічэнне колькасці спартыўных гульнявых пляцовак. Яшчэ адзін кірунак датычыць добраўпарадкавання тэрыторый. Пяць пераможцаў сёлета атрымаюць фінансавую падтрымку на рэалізацыю праектаў.

Напрыклад, у Ляхавіцкім раёне плануецца ўстанавіць помнік спаленым вёскам. Аўтары ініцыятывы ўжо падабралі ўчастак у вёсцы Марынава. Менавіта тут адбыўся першы бой на тэрыторыі раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Паводле задумкі, манумент будзе ўяўляць сабой тры абгарэлыя коміны. Над імі ўздымаецца бусел як сімвал страчанага гнязда і загінулых у час вайны.

У Пінскім раёне маюць намер устанавіць скульптурную кампазіцыю ў гонар 80-годдзя Вялікай Перамогі. Гэта ініцыятыва належыць маладзёжнаму парламенту. На ўскраіне Пінска моладзь прапанавала паставіць помнік, які стане сімвалам укладу кожнага беларуса ў вызваленне роднай зямлі ад акупантаў.

Брастаўчане сваю ініцыятыву назвалі «Здаровы горад». У скверы па вуліцы Маскоўскай плануецца ўстанавіць комплекс вулічных трэнажораў. Прыхільнікі паляпшэння ваенна-патрыятычнага выхавання і дапрызыўнай падрыхтоўкі вучняў цэнтра «Шчыт» з Івацэвічаў... з Іванава аформілі ініцыятыву па развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтра. Вёску з 600-гадовай гісторыяй Моўчадзь Баранавіцкага раёна ўпрыгожыць арт-аб'ект «Зубр». Ён з'явіцца ў гонар 85-годдзя Брэсцкай вобласці і юбілейнай даты населенага пункта.

Дарэчы, Моўчадзь стане адным з адрасоў наведвання ўдзельнікаў рэспубліканскай нарады па пытаннях самакіравання, якая адбудзецца ў канцы верасня. Пасяджэнне пройдзе на базе горада Баранавічы, Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. Удзельнікі наведаюць школу № 1 Баранавіч, дзе рэалізавана шмат цудоўных ініцыятыў. Адна з іх увасоблена ў Музеі народнага адзінства, дарэчы, першы падобны музей у нашай краіне. У школе вельмі многа робіцца для выхавання ў дзяцей усведамлення неабходнасці падтрымання памяці пра Вялікую Айчынную вайну, пра генацыд беларускага народа. У кантэксце гаворкі пра Баранавічы нельга абысці ўвагай яшчэ адну грамадзянскую ініцыятыву, не так даўно рэалізаваную. Гэта помнік нашым лётчыкам-героям — Мікіту Кукаьенку і Андрэю Нічыпорчыку. Цяпер ёсць не толькі помнік, але і мемарыяльныя дошкі на вуліцах, названых у гонар афіцэраў-пілотаў, якія здзейснілі подзвіг у небе над горадам.

Сёння можна гаварыць і пра Пінскі раён, дзе гэта работа праводзіцца на належным узроўні. Адным са знакавых праектаў апошніх гадоў стала ўзвядзенне помнікаў героям вайны, якія праславіліся на Піншчыне. Тры помнікі ўжо ўстаноўлены. У вёсцы Лапаціна цяпер ёсць бюст Дзмітрыю Трэмасаву. Зусім малады хлопец, кулямётчык Дзмітрый Трэмасаў быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях за вызваленне Піншчыны.

Таксама ўвекавечана памяць легендарнага партызанскага камандзіра Васіля Каржа, які ўзначаліў першы на тэрыторыі краіны партызанскі бой з ворагам. Дарэчы, амаль чатыры дзясяткі прадпрыемстваў розных формаў уласнасці прынялі ўдзел у фінансаванні помніка, які цяпер стаіць у вёсцы Ставок. Можна сказаць, што помнік Каржу зрабілі талакой. А крыху больш за месяц таму, 13 ліпеня, у вёсцы Пачапава адкрылі бюст Герою Савецкага Саюза гвардыі маёру Ціхану Калініну, які ў гэты дзень 1944 года загінуў падчас аперацыі па вызваленні Пінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Як ужо гаварылася, адна з грамадзянскіх ініцыятыў, што перамагла ў конкурсе, датычыць узвядзення яшчэ аднаго памятнага знака да 80-годдзя Перамогі.

Ну, а падтрыманне ў належным парадку памятных месцаў заўсёды было на парадку дня мясцовай улады. На гэтай рабоце, якая праводзіцца пастаянна, мы засяроджваем увагу на нарадах, на пасяджэннях прэзідыума, на сесіях усіх узроўняў, у тым ліку выязных.

> «Аптымізм усяляюць тыя справы і пачынанні, якія сведчаць пра нераўнадушнасць людзей, пра іх жаданне палепшыць свой горад альбо сваю вёску. Маю на ўвазе найперш рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў. Насамрэч гэтых ініцыятыў вельмі многа, не заўсёды мы і ведаем пра іх, бо людзі іх нейкім чынам не афармляюць альбо не заяўляюць пра іх. Скажам, выйшлі пяць чалавек з суседніх дамоў і засыпалі праблемны ўчастак дарогі альбо сабраліся на невялікі суботнік і пасадзілі дрэвы насупраць сваіх двароў. Гэта і ёсць рэалізаваная ініцыятыва».

***— Прапаную пагаварыць аб практыцы работы выязных сесій. Іх нярэдка называюць школай дзейнасці, асабліва для дэпутата-пачаткоўца. Ужо ў гэтым скліканні адна з сесій праходзіла з выездам на месца. Ці маеце намер далей практыкаваць такую форму работы дэпутатаў абласнога Савета?***

— Вядома, будзем, бо выязная сесія — адна з найбольш эфектыўных форм работы дэпутатаў. На месцы ёсць магчымасць убачыць аб'ект альбо вытворчасць на свае вочы, атрымаць інфармацыю з першых вуснаў, каб адказна прымаць рашэнне, выпрацоўваць рэкамендацыі, засяроджваць увагу на праблемах. У новым скліканні мы правялі ўжо тры вялікія выязныя мерапрыемствы. На пасяджэнні прэзідыума аблсавета з удзелам старшынь раённых і сельскіх Саветаў разглядалі работу органаў самакіравання па навядзенні парадку на зямлі, добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Для зручнасці работы ўдзельнікі нарады падзяліліся на тры групы, гэта дало магчымасць наведаць больш аб'ектаў. Такім чынам, паглядзелі прыклады добраўпарадкавання у Парахонску, Лагішыне, а таксама ў Пінску. У Пінску мы пазнаёміліся як з падыходамі да новай забудовы, так і з добраўпарадкаваннем старых кварталаў, дамоў, узведзеных у 60-я гады. На пленарным пасяджэнні ў асноўным засяродзіліся на праблемных пытаннях і шляхах іх вырашэння. Прагучаў шэраг прапаноў, якія стануць нагодай для разгляду як у абласным Савеце, так і, магчыма, у камісіях парламента.

Медыцынскае і гандлёвае абслугоўванне сельскага насельніцтва сесія абласнога Савета разглядала на прыкладзе Брэсцкага раёна. Была магчымасць не толькі наведаць амбулаторыі, ФАПы, магазіны, іншыя гандлёвыя аб'екты, але і паразмаўляць з людзьмі, пацікавіцца меркаваннем спецыялістаў і сельскіх жыхароў. Сесія атрымалася інфармацыйна насычаной, было што абмяркоўваць на пленарным пасяджэнні.

Дэпутаты наведалі амбулаторыю, у мадэрнізацыю якой укладзены вялікія сродкі, і ФАП, які перажыў бюджэтны рамонт, але цалкам адпавядае патрабаванням і выконвае сваю функцыю. Бо галоўным уяўляецца, каб людзі атрымлівалі своечасовую і якасную медыцынскую дапамогу.

Кіраўнікі гандлёвых арганізацый падчас сесіі ўздымалі праблемы, звязаныя з недахопам кадраў, адзначалі сацыяльную функцыю аўтакрамы. І гэтыя праблемы патрабуюць пастаяннай увагі ў тым ліку прадстаўнікоў мясцовай улады, важная актыўнасць кожнага дэпутата.

***— Прысутнічала на двух выязных мерапрыемствах, пра якія вы сказалі, і звярнула ўвагу, што на падобных форумах заўсёды робіцца акцэнт на ролю дэпутатаў, іх прыклад...***

— Вядома, у вобласці цяпер каля дзвюх тысяч дэпутатаў усіх узроўняў. Народныя выбраннікі павінны быць прыкладам ва ўсіх добрых справах. Часам, каб вырашыць канкрэтную праблему на якой-небудзь тэрыторыі, дастаткова той жа суботнік арганізаваць. Напрыклад, навесці парадак на могілках. Па сваёй ранейшай рабоце ведаю, што гэта не дробязнае пытанне. Напрыклад, у адной з вёсак Пінскага раёна вясной людзі выйшлі і прыбралі могілкі, папярэдне сабралі значную суму грошай на іх добраўпарадкаванне. А ў суседняй вёсцы аб'явілі суботнік, але ніхто не прыйшоў. Гэта гаворыць аб тым, што мы недастаткова праводзім тлумачальную, выхаваўчую работу. І яшчэ, як паказвае практыка, больш актыўнымі ў агульных справах выступаюць людзі старэйшага пакалення, людзі з савецкай загартоўкай. У той час паехаць на сельгасработы, выйсці на суботнік было за правіла, бо панавала псіхалогія ўсеагульнага калектывізму. А потым не паспелі азірнуцца, як ёй на змену прыйшла заходняя псіхалогія індывідуалізму. І вось мы маем, што маем: прадстаўнікі маладзейшага пакалення нярэдка чакаюць ад улады, каб пасадзілі клумбу, прыбралі лішнюю раслінасць, умоўна кажучы, насупраць іх дома. І з гэтым трэба змагацца. Ідэалагічнае імпартазамяшчэнне сёння не менш важнае, чым эканамічнае. Трэба вяртаць традыцыі спрадвечнай беларускай талакі. Бо вядома, што тую спартыўную пляцоўку, якую ўладкавалі разам, альбо клумбу, якую разбілі агульнымі намаганнямі, жыхары дома, вуліцы, мікрараёна будуць і берагчы разам. Усё сказанае і ёсць клопат мясцовых Саветаў.

***— Нярэдка чуем: «А што можа мясцовая ўлада? У яе няма сродкаў, асобнага бюджэту»...***

— Насамрэч можа шмат. Тыя дакументы, якія рыхтуюцца і прымаюцца ў рамках нашых паўнамоцтваў, маюць сілу закона на сваіх тэрыторыях. Пры іх распрацоўцы варта ўлічваць асаблівасці тэрыторыі, кола людзей, на якія будзе распаўсюджвацца дзеянне дакументаў. Гэта датычыцца усіх узроўняў, пачынаючы з сельскага Савета, які можа прыняць рашэнне, напрыклад, па безгаспадарнай пабудове, канкрэтным участку зямлі. Раённы Савет у рамках паўнамоцтваў прымае рашэнне ў межах раёна, і так па прыступках — да парламента, рашэнне якога становіцца абавязковым для ўсіх. Трэба толькі праяўляць актыўнасць, не шкадаваць часу і намаганняў пры выпрацоўцы і афармленні прапаноў, як і ў выпадках з грамадзянскімі ініцыятывамі. У рэшце рэшт усе нашы намаганні накіраваны на паляпшэнне дабрабыту людзей і захаванне міру на нашай зямлі, а перадумовай для гэтага з'яўляецца стваральная праца ўсіх і кожнага члена грамадства.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «Галоўнае — з усімі сябраваць»

## Дэпутаты Магілёўскай вобласці падзяліліся ўражаннямі ад двухдзённай летняй спартакіяды

**Традыцыйная дэпутацкая спартакіяда прайшла ў багатым на маляўнічыя краявіды Асіповіцкім раёне. На працягу двух дзён дэпутаты спаборнічалі, адпачывалі, сасаваліся ў нефармальнай абстаноўцы. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел 24 каманды з усіх раёнаў вобласці, а таксама з Магілёва і Бабруйска. Іх вітаў член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Аляксандр ГАРОШКІН. Гэтым разам спартакіяда праходзіла пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

— Мы вельмі стараліся, каб усё было на вышыні, — адзначыў **старшыня Асіповіцкага райсавета Уладзімір РЫЖАНКОЎ.** — Месца выбіралі з асаблівай стараннасцю, трэба было, каб яно адпавядала ўсім патрабаванням, каб былі выкананы санітарныя нормы. Па сутнасці, рыхтавалі ўсім раёнам. Без дапамогі выканаўчай улады райсавет не змог бы такое мерапрыемства арганізаваць. Тут і міліцыя была задзейнічана, і ратавальнікі, і медработнікі.

Дэпутаты ацанілі намаганні асіповіцкіх калег і выкладваліся па поўнай. Было столькі эмоцый, падзей, спартыўнага напалу, што час ляцеў непрыкметна. Лідары вызначыліся ва ўпартай і бескампраміснай барацьбе. Першае агульнакаманднае месца заняла каманда дэпутатаў Асіповіцкага райсавета, на другім — каманда з Чавусаў, на трэцім — з Касцюковіч.

Перамога Асіповіцкага райсавета, на думку яго старшыні, — вынік прадуманай стратэгіі і грунтоўнай падрыхтоўкі. Да таго ж спартакіяда была «дамашняя», на сваёй тэрыторыі нельга было прайграць.

— Дэпутацкі корпус амаладзіўся, прыйшлі тыя, хто ставіцца да спорту з асаблівай павагай, — адзначыў Уладзімір Рыжанкоў. — Напрыклад, наш Андрэй Бабіч, які ў сілавым відзе спорту заняў першае месца. Па шашках у нас прызавое трэцяе месца. І, галоўнае, мы спецыяльна рыхтавалі эстафету. Тры саставы памянялі перад тым, як выставіць каманду. Падбіралі людзей, трэніраваліся і перамаглі. Усе адказна аднесліся да мерапрыемства, бо годна сябе паказаць — гэта гонар і прэстыж для раёна.




Першае, што адзначыў **старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН**, — арганізацыя спартакіяды была выдатная.

— Лічы, у госці да калег з'ездзіў. Асіповічы з поўнай адказнасцю паставіліся да арганізацыі мерапрыемства. Мы вельмі ўдзячныя за прыём.

Чавуская каманда, як заўсёды, паказала высокі клас у жаночым тэнісе, дзякуючы маладым і спрытным дэпутатам узяла другое месца ў эстафеце.

— У нас галоўнае — каманда, — адзначае Анатоль Мацюлін. — Усе загадзя настройваюцца на перамогу, рыхтуюцца. Мы ніякія не гросмайстры, ні майстры спорту — звычайныя раённыя і сельскія дэпутаты. Сэнс гэтых спаборніцтваў — выпрацаваць камандны дух, аб'яднаць, накіраваць на вынік. Мерапрыемства аб'ядноўвае людзей. Спартакіяда вучыць гуртавацца для вырашэння пытання. А яшчэ — пазнаёміцца з калегамі з іншых раёнаў, даведацца, як яны там працуюць.

У касцюковіцкай каманды свае перамогі: у асабістых заліках першае месца па шашках, другое — па тэнісе і лёгкай атлетыцы. У астатніх відах спорту таксама паказалі сябе нядрэнна. У выніку агульнакаманднае трэцяе месца.

— У нас стабільнасць, — усміхаецца **старшыня Касцюковіцкага райсавета Ларыса ГЕРАСІМАВА.** — Летась таксама былі трэція. А па шашках у асабістым заліку першыя. Наш дэпутат Васіль Гарэлаў у гэтым відзе спорту непераможны. Каманда ў нас згуртаваная, дружная. У яе ўліліся новыя дэпутаты, і тыя, хто ездзіў з намі ўпершыню, казаў, што ніколі не жылі ў палатках і не ведалі, як гэта цудоўна. У нас выключны шэф-кухар, таксама дэпутат, гатуе на ўсіх дэпутацкіх мерапрыемствах. Гэта наш старшыня Сялецкага сельсавета Сяргей Прахарэнка. Да нашага прыезду са спаборніцтваў ужо на метровага дыяметру патэльні шкварчала каўбаса.

На высокія спартыўныя поспехі дэпутатаў заахвочвае Магілёўская абласная асацыяцыя Саветаў мясцовых дэпутатаў. Яна з'яўляецца асноўным арганізатарам мерапрыемства, каардынуе падрыхтоўку і правядзенне спаборніцтваў, забяспечвае прызамі.

— Акрамя таго, што нашы пераможцы медалі і дыпломы атрымалі, было шмат іншых прыемных момантаў, — кажа **дырэктар асацыяцыі Паліна ЦЕРАШКОВА.** — У якасці прызоў мы падарылі ім спартыўныя тавары, палаткі, амуніцыю, спальныя мяшкі, масажныя дыванкі. Прызы заўсёды падбіраем з сэнсам. Каб людзям было карысна.

**Старшыня Магілёўскага аблсавета Аляксандр ГАРОШКІН**, падсумоўваючы вынікі летняй спартакіяды, сказаў, што пераможцы — усе.

— Мы атрымалі зарад бадзёрасці, станоўчага настрою, адзін ад аднаго падсілкаваліся энергіяй, — адзначыў ён. — Вельмі ўдзячны за цярпенне, за добрую падрыхтоўку. Перамог той, хто больш рыхтаваўся і каму крыху пашчасціла. Але спадзяюся, што ў наступную спартакіяду пераможцы таксама будуць годныя. Галоўнае — заставацца бадзёрымі і здаровымі. І берагчы мірнае неба над нашай галавой.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіваў суразмоўнікаў.**

# «Каб у дзяцей былі ўсмешкі»

## КОТГС зладзіў свята для маленькіх мінчан

**На мінулым тыдні прадстаўнікі калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 120 Кастрычніцкага раёна сталіцы далучыліся да дабрачыннай акцыі «Збяром партфель разам». Акрамя школьных рэчаў актывісты КОТГСа падарылі юным мінчанам сапраўднае свята, а таксама незабыўныя эмоцыі і самы смачны салодкі стол. Карэспандэнт «Звязды» не змог не далучыцца да добрай акцыі.**

«На тэрыторыі абслугоўвання мы напрамую ўзаемадзейнічаем з жыхарамі і мясцовымі ўладамі. Разам з імі далучаемся да сур'ёзнай стваральнай працы, нярэдка праводзім сумесныя акцыі, — расказаў **намеснік старшыні калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 120 Сяргей РАЗЖЫВАЙКІН.** — І сёння мы далучыліся да важнай рэспубліканскай акцыі «Збяром партфель разам». З задавальненнем дапаможам усім сем'ям. Асабліва тым, хто сёлета пойдзе першы раз у першы клас».

Першы клас — гэта першыя школьныя падручнікі, урокі, сябры і, несумненна, яркія эмоцыі. Для дзяцей, якія выйшлі з дзіцячага садка, пачынаецца новае жыццё. «Любому першакласніку прыемна, калі ў яго будзе свой школьны набор. Для гэтага мы запрасілі сем'і з дзецьмі. Знайсці іх дапамог наш тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У спакойнай атмасферы абмяркуем тыя пытанні, якія хвалююць грамадзян. Пасля ўручым дзецям падарункі», — падзяліўся Сяргей Разжывайкін.

Ён дадаў, што КОТГС № 120 Кастрычніцкага раёна сталіцы заўсёды бярэ ўдзел у жыцці насельніцтва, а ўсе мерапрыемствы праводзяцца пад кіраўніцтвам старшыні Алега Брашко. І гэтая акцыя — не выключэнне. Усе зараджаны на стваральную працу і вынік.

«Таксама праводзім акцыю да Дня абароны дзяцей. У пачатку лета складана сабраць іх: хтосьці — у лагерах, хтосьці — у вёсцы, хтосьці — на адпачынку. Сёння ж мы змаглі запрасіць шмат дзетак. Член нашага КОТГСа Ганна Сяргееўна правядзе з дзецьмі розныя спартыўныя актыўнасці і займальныя конкурсы. Завершыцца ўсё чаяваннем», — адзначыў намеснік старшыні.

На такіх акцыях КОТГС становіцца бліжэйшым да жыхароў раёна. Яго актывісты заўсёды імкнуцца інфармаваць аб усіх мерапрыемствах, якія праводзяць. «У асноўным, праводзім суботнікі, прыёмы грамадзян і дэпутацкія сустрэчы. Мы заўсёды разам, плячо ў плячо працуем на карысць нашых жыхароў. Наша галоўная мэта — з'яднаць насельніцтва. Людзі павінны ведаць: пры неабходнасці мы заўсёды прыйдзем на дапамогу і зробім усё, што ў рамках нашай кампетэнцыі. Сёння ў раёне мы бачым дагледжаныя клумбы, прыгожыя лавачкі і чыстыя пад'езды. Актыўна развіваем гэты кірунак, далучаем жыхароў да прыгажосці і заўсёды падтрымліваем», — падкрэсліў Сяргей Разжывайкін.

Сёння ў КОТГСе № 120 Кастрычніцкага раёна сталіцы працуе дзевяць чалавек. Няхай менш, але лепш, адзначаюць прадстаўнікі калегіяльнага органа.

Пасля ўручэння прыемных падарункаў і завяршэння актыўнасцяў паразмаўлялі з людзьмі. У **мінчанкі Юліі** чацвёра дзяцей. Старэйшаму сыну 18 гадоў, адна дачка ідзе ў чацвёрты клас, другая — у першы і самая маленькая — у дзіцячы садок. Шматдзетная маці падзялілася сваімі ўражаннямі: «Прыемна, што нас запрасілі на такое мерапрыемства. Усё вельмі спадабалася! Раней нас ніколі не запрашалі на падобныя сустрэчы, але мы заўсёды хадзілі на ўсе гульні і конкурсы, якія праводзіць наш КОТГС. Дзякуй ім за тое, што яны заўсёды побач!»



Наступны суразмоўца — **мінчанка Ірына** — сёлета адправіць сына Мацвея ў пяты клас, а дачку Ксенію — у сёмы. На такой прыемнай сустрэчы яны таксама ўпершыню: «Гэта выдатна, нам вельмі прыемна, што пра нас памятаюць! Я даўно ведаю сакратара КОТГСа Яўгенію, якая праводзіць класныя мерапрыемствы для дзяцей і іх бацькоў. Малым з ёй вельмі падабаецца, а для мяне гэта самае галоўнае. Яшчэ раз хацелася б падзякаваць за такую добрую ініцыятыву».

«Самае важнае для нас — зрабіць так, каб у нашых дзяцей былі ўсмешкі», — падагульніў Сяргей Разжывайкін. І, мяркуючы па ўбачаным і пачутым тут, у членаў калегіяльнага органа ўсё выдатна атрымалася.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.896. Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2024 года.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Лад жыцця

# Што і колькі піць у спякоту?



**Гэтае лета багата на спякотныя дні. Правілы паводзін у такое надвор'е, а менавіта захаванне некаторых рэкамендацый пітнога рэжыму, — бадай, самае важнае, пра што неабходна паклапаціцца. Ва ўмовах гарачага надвор'я наш арганізм хутка губляе вадкасць, што пагражае абязводжваннем і перагрэвам. Як своечасова папаўняць запасы вады ў арганізме, правільна арганізаваць і прытрымлівацца пітнога рэжыму, расказала ўрач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Руфіна ГАЛЯМАВА.**

— Існуе меркаванне, што чалавек павінен выпіваць у дзень не менш за два літры вады. Насамрэч гэтыя лічбы занадта абагульненыя. Рацыянальна выкарыстоўваць формулу: 30 мл вады памножыць на вагу чалавека, — звяртае ўвагу ўрач.

Правільны пітны рэжым у гарачае надвор'е дазволіць вырашыць некалькі важных задач, у прыватнасці, абароніць скуру ад перасыхання і захавае маладосць, дапаможа вывесці шкодныя рэчывы з арганізма, выключыць верагоднасць абязводжвання і цеплавога ўдару.

Таму вазьміце за правіла ў летні час заўсёды трымаць бутэльку чыстай пітной вады пры сабе. Як толькі адчуеце смагу, стомленасць, сухасць у роце ці іншыя прыкметы абязводжвання, неадкладна рабіце некалькі глыткоў.

— Вада — не толькі жыццёва неабходны прадукт для чалавека, але і натуральны спосаб астуджэння арганізма. Найбольш аптымальны час прыёму вадкасці — за паўгадзіны да і пасля ежы. Калі тэмпература на вуліцы зашкальвае і вам увесь час хочацца піць, не стрымлівайце сябе. Цярпець смагу недапушчальна, — папярэджвае ўрач.

Аднак каб яе наталіць, не падыходзяць салодкія напоі, чорная гарбата і кава. Лепш аддаць перавагу чыстай вадзе, зялёнаму чаю ці несалодкім фруктова-ягадным узварам. І памятайце: чым больш вы знаходзіцеся пад прамымі сонечнымі праменямі, тым больш вадкасці неабходна ўжываць.

Людзі, якія праводзяць будні ў офісе пад кандыцыянерам, могуць і не адчуць розніцы ў сезоннай рабоце арганізма. А вось тыя, хто ўвесь час знаходзіцца на свежым паветры, павінны паклапаціцца аб рэгулярным папаўненні воднага балансу.

**ВАЗЬМІЦЕ ЗА ПРАВІЛА:**

1. Выпівайце 1-2 шклянкі вады раніцай, за паўгадзіны да сняданку. Гэта дазволіць папоўніць «начныя» страты вадкасці ў арганізме.
2. Праз паўгадзіны-гадзіну пасля сняданку неабходна выпіць яшчэ 0,5 л вадкасці. У летні перыяд проста замяніце кубак ранішняй кавы на шклянку вады.
3. На працягу дня кожную гадзіну ўжывайце вадкасць невялікімі порцыямі.

Скажыце, доктар...

# З ХВОРАЙ ГАЛАВЫ — НА ЗДАРОВУЮ

## Чаму ўзнікае галаўны боль і як з ім справіцца?

**Галаўны боль — праблема настолькі глабальная, што спецыялісты нават распрацавалі Міжнародную класіфікацыю галаўных боляў. Мабыць, няма чалавека, які не ведае, што гэта такое, бо 98 % насельніцтва планеты перыядычна адчуваюць боль у асобных частках (патыліцы, скронях) або па ўсёй галаве. Міжнароднае таварыства галаўнога болю (IHS) вылучае больш за 180 відаў цэфалгій. Якія іх асноўныя прычыны? Як адрозніць галаўны боль ад мігрэні? Які галаўны боль нельга трываць? Як дапамагчы сабе ў хатніх умовах і колькі таблетак можна прыняць, каб аблегчыць пакуты? Пра гэта размаўляем з неўролагам 11-й гарадской паліклінікі Гюлабацін ЗАКІРЗАДЭ.**

***— З чым можа быць звязаны галаўны боль? Якія яго асноўныя прычыны?***

— Галаўны боль — адна з самых распаўсюджаных скаргаў пацыентаў на прыёме. Ён можа быць звязаны з інфекцыйнымі, запаленчымі, сасудзістымі захворваннямі, артэрыяльным ціскам, траўмай, псіхічнымі расстройствамі, стрэсам, пухлінамі, пабочным дзеяннем лекаў. Акрамя таго, можа з'яўляцца сам па сабе асноўным захворваннем, як, напрыклад, мігрэнь, галаўны боль напружання, кластарны галаўны боль, якія ўзнікаюць на фоне спадчыннай схільнасці і праяўляюць сябе пры дзеянні правакацыйных фактараў — стрэсу, гарманальнага фону, парушэнняў сну, ужывання алкаголю, знаходжання ў душных памяшканнях, перападаў атмасфернага ціску, артэрыяльнага ціску.

***— Чым галаўны боль адрозніваецца ад мігрэні? Як з ім справіцца?***

— Мігрэнь характарызуецца аднабаковай лакалізацыяй (часцей за ўсё гэта скроневая вобласць), высокай інтэнсіўнасцю (гэты галаўны боль настолькі моцны, што прымушае чалавека спыніцца, узяцца за галаву, прылегчы, прысесці), пацыент падчас прыступу шукае ціхае і цёмнае месца (шум ці святло ўзмацняюць галаўны боль), можа суправаджацца аўрай (млоснасць, ваніты, зрокавыя галюцынацыі). Каб сказаць, што гэта менавіта мігрэнь, неабходна мінімум пяць эпізодаў падобнага галаўнога болю.

Падчас прыступу мігрэні неабходна ў першыя 15 хвілін прыняць прэпарат з групы нестэроідных супрацьзапаленчых (ібупрафен, німесулід, парацэтамол, цытрамон) або, калі ні адзін з іх не эфектыўны, — з групы трыптанаў (суматрыптан, золмітрыптан).

***— Калі пры змене надвор'я баліць галава, гэта і ёсць мігрэнь?***

— Галаўны боль пры змене надвор'я можа быць звязаны з хранічнымі захворваннямі (напрыклад, павышаны артэрыяльны ціск, атэрасклероз, захворванні сэрца, лёгкіх, артрыты, артрозы), наступствамі захворванняў нервовай сістэмы (чэрапна-мазгавых траўмаў, інсультаў, энцэфалітаў) або метэаадчувальнасцю.

***— У якім выпадку з галаўнымі болямі трэба звяртацца да ўрача? Якія сімптомы могуць сведчыць, што марудзіць нельга?***



— Грознымі сімптомамі галаўнога болю з'яўляюцца наступныя. Калі ён упершыню ўзнік пасля 50 гадоў; з часам змяніў свой ход; высокаінтэнсіўны; аднабаковы; з часам прагрэсіруе; не праходзіць пасля прыёму прэпаратаў; суправаджаецца павышэннем тэмпературы цела; узнік на фоне ацёку дыска глядзельнага нерва, ВІЧ-інфекцыі, анкалагічнага, эндакрыннага і інш. захворванняў або траўмы галавы; галаўны боль падчас цяжарнасці; суправаджаецца стратай прытомнасці.

Больш за ўсё пры галаўным болі мы баімся інсульту (кровазліцця ў абалонкі мозгу або непасрэдна ў мозг), які характарызуецца высокаінтэнсіўным галаўным болем, не праходзіць пасля прыёму лекаў і суправаджаецца слабасцю або здранцвеннем у канечнасцях, глядзельнымі парушэннямі, млоснасцю, ванітамі, стратай прытомнасці. Пры ўсіх пералічаных сімптомах трэба неадкладна звяртацца да ўрача.

***— Пра што можа казаць галаўны боль, які ўзнікае падчас інтэнсіўнай фізічнай нагрузкі? Што рабіць у такім выпадку?***

— Галаўны боль, які ўзнікае падчас інтэнсіўнай фізічнай, разумовай нагрузкі, таксама патрабуе звароту па медыцынскую дапамогу. Пакольки можа быць выкліканы не толькі неўралагічнымі прычынамі (мігрэнь, галаўны боль напружання, кластарны галаўны боль), але і сардэчна-сасудзістымі ці наступствам траўмы. Таксама неабходна адзначыць, што падобны галаўны боль не рэдкасць у спартсменаў, і ў выпадку яго ўзнікнення ўрач прызначае карэкцыровачнае лячэнне.

Пры з'яўленні падобнага галаўнога болю неабходна спыніць трэніроўку, памераць ціск, пульс, выпіць вады, у выпадку, калі галаўны боль не спыняецца, прыняць анальгетыкі.

***— Якія ёсць спосабы справіцца з галаўным болем у хатніх умовах? Калі галава баліць моцна, колькі можна выпіць таблетак за дзень?***

— Падчас галаўнога болю неабходна прысесці ці паляжаць, можаце выканаць лёгкі масаж шыі ці скроневай вобласці галавы, лёгкія практыкаванні на мышцы спіны, шыі і галавы. Калі боль не праходзіць, то неабходна выпіць анальгетыкі. Старайцеся не прымаць больш за тры таблеткі ў дзень. Перад прыёмам прэпарату неабходна пагледзець максімальную сутачную дазіроўку канкрэтнага прэпарату і не перавышаць яе.

Карысна ведаць

# Сардэчная дыетычная гародніна

## Чым карысны кабачок?

**Стары жарт кажа: «У дачнікаў дзве бяды — неўраджай і ўраджай». Вось і надышоў той час, калі аграномы-аматары ламаюць галаву, куды б прыстроіць лішнія кабачкі. Калі вам прапанавалі гэту немудрагелістую гародніну, не спяшаецеся адмаўляцца, бо гэты пасрэдны плод — сапраўдная скарбніца карысных рэчываў.**

Прыкладна на 95 працэнтаў кабачок складаецца з вады і харчовых валокнаў. Апошнія настолькі далікатныя, што пюрэ з гэтай гародніны з'яўляецца ідэальным першым прыкормам для малых.

— У арганізме чалавека харчовыя валокны ўбіраюць у сябе і выводзяць розныя шкодныя рэчывы, паляпшаюць перыстальтыку кішэчніка, спрыяюць нармалізацыі стрававання, дабратворна ўздзейнічаюць на мікрафлору стрававальнага тракта, — расказвае **інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.**

Багатыя кабачкі вітамінам С: у 100 г гэтай гародніны змяшчаецца каля 17 % ад рэкамендаванай сутачнай нормы. А аскарбінавая кіслата павялічвае ўстойлівасць арганізма да інфекцый, валодае антыаксідантнымі ўласцівасцямі (дапамагае клеткам хутчэй аднаўляцца, аптымізуе абмен рэчываў, запавольвае старэнне), удзельнічае ў кроваўтварэнні, спрыяе засваенню жалеза.

Бэта-каратін (папярэднік вітаміну А), які маецца ў кабачках, неабходны для здароўя вачэй, нармальнага функцыянавання імуннай сістэмы і падтрымання здароўя скуры.

Ёсць у карысной гародніне і вітаміны групы В, Е, К, РР, мінеральныя рэчывы — калій, магній, медзь. Калій і магній неабходны для падтрымання нармальнай работы сэрца, крывяноса ціску, прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў, функцыянавання нервовай сістэмы. Медзь уплывае на актыўнасць вітамінаў, гармонаў, ферментаў.

Стравы з кабачкоў вельмі папулярныя ў прыхільнікаў здаровага харчавання і ахвотных пахудзець, бо ў 100 грамах прадукту змяшчаецца ўсяго 24-27 кілакалорый.



Кабачок можна есці ў сырым выглядзе, марынаваць, варыць, тушыць, запякаць, фаршаваць, пячы на патэльні і грылі, рабіць з яго варэнне, кабачковую ікру, дадаваць у салаты, аладкі ці суп.

— Нягледзячы на шматлікія карысныя ўласцівасці, непажадана ўжываць у вялікіх колькасцях кабачкі людзям з хранічнай ныркавай недастатковасцю, з парушэннем вывядзення калію, пры павышаным утрыманні ў мачы аксалатаў (могуць спрыяць фармаванню камянёў у нырках), пры індывідуальнай непераноснасці гэтага прадукту, — папярэджвае Юлія Клімчанка.

Уражанне

# «Вялікае Палескае Міжрэчча» берасцейскага пісьменніка

Трымаю ў руках толькі што выдадзены брэсцкім прыватным выдавецтвам «Альтернатива» зборнік празаічных твораў таленавітага пісьменніка-берасцейца Аляксандра Валковіча «Дзень шэпту траў». У яго ўключаны нарысы, дарожныя нататкі, замалёўкі, эсэ, напісаныя аўтарам за апошні час. Новая кніга складаецца з твораў на розныя тэмы і падзелена на чатыры раздзелы. Першы адкрываецца аповесцю «Злавіць вугра ў расістай траве». Здаецца, што размова пойдзе пра рыбаловаў, пра іх прыгодніцкія здарэнні. Тым больш што сам аўтар з першага кніжнага радка заяўляе: «Рыбак з мяне знатны». На самай жа справе ў тэксце закладзены і выразна прасочваецца філасофскі сэнс, прысутнічаюць, акрамя флоры і фаўны, рэаліі гістарычнага і цяперашняга жыцця на Палессі.

Адным з цікавых вобразаў аповесці з'яўляецца рыба вугор, якую апавядальнік упершыню ўбачыў яшчэ падлеткам, седзячы раніцай з вудай на беразе ракі дзяцінства. Каля дзясятка гэтых дзіўных асобін, падобных да змей, падняўшы вострыя галовы, паўзло па роснай траве з агарода, засеянага аўсом і гарохам, у сваю водную стыхію.

Усё жыццё пранасіў у памяці пісьменнік гэты ўразлівы выпадак і вось — усё-такі дапасаваў гэтую паўзуча-вадзяную істоту да свайго новага твора. Ды яшчэ як удала! Бо на прыкладзе вугроў, якія сустракаюцца амаль ва ўсіх вадаёмах зямнога шара, а нерастуюць толькі ў цёплым Саргасавым моры Атлантыкі, паказаў, як добра і мудра ў жывой прыродзе адладжана жыццё, даказаў, што азначае тая мясціна, дзе ты нарадзіўся на свет, дзе твая малая радзіма!

Бо і праўда: усім істотам хапае месца на зямлі, кожная асобіна ведае, дзе можна пажывіцца, а дзе — прадоўжыць род. І толькі людзі ніяк не навучацца жыць мірна і дружалюбна, толькі чалавечы род, хоць і надзелены вышэйшым розумам, мовай, умелымі рукамі, чамусьці ніяк не могуць падзяліць паміж сабой зямлю, яе багацце, чамусьці схільны да сварак, міжусобіц, адкрытых сутычак, працяглых войнаў.

У гэтай аповесці, як і ў наступнай «Хадзілі мы паходамі...», яскрава адчуваецца пакутлівае шкадаванне і сум аўтара па недалёкім мінулым часе, калі беларускае і ўкраінскае Палессе, названае аўтарам «Вялікім Палескім Міжрэччам», было агульным, супольным багаццем, падораным прыродай народам дзвюх рэспублік; калі людзі ад Брэста да Жытоміра, ад Мухаўца да Дняпра жылі ў адзінай сям'і, у дружбе і згодзе, параваліся і радніліся і дзе будучаму пісьменніку, выпускніку факультэта журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча давялося праходзіць службу ваенным карэспандэнтам, а ў апошнія два дзесяцігоддзі падчас рыбацкіх паходаў, карэспандэнцкіх вандровак, фальклорных экспедыцый — асэнсоўваць, абдумваць мінулае і сучаснае гэтага краю, прасторы якога за ўсё жыццё аб'ездзіў уздоўж і ўпоперак. «Усякіх бед і крывей, захлынаючыся, наглыталася гэтая зямля, шмат пераварыла чужынства ў сваіх лясах і балотах дый выплюхнула чужароднае ручаямі і рэкамі — і сабою адзінай засталася. Старажытнай і абноўленай. Палескае Міжрэчча...», — разважае пісьменнік.

Шчыміць, не сціхае ў сэрцы аўтара боль і светлая настальгія па разарваных па-жывому глыбінных каранях двух славянскіх народаў, па знішчаных агульначалавечых духоўных, культурных, роднасных сувязях, народных традыцыях, супольных інтарэсах. «А гэта прыводзіць да небяспечных, пагрозлівых міжусобіц», — з горыччу зазначае аўтар.

Другая частка кнігі атрымала назву «Дзень шэпту траў». У яе ўвайшло восем апавяданняў, а фактычна ўспамінаў аўтара, развагі пра адносіны да людзей, свае карані, спадчыну, да захаваных каштоўнасцяў, да духоўнасці, рэлігіі, жывой прыроды. А ўжо «Оду дранікам» можна смела лічыць сапраўднай квінтэсэнцыяй пачуццяў пісьменніка да ўсяго беларускага і роднага.

І ніякай аўтарскай выдумкі ў кнізе няма. Гэта нарысавая проза, а не фантастыка. Усё напісанае ўзята з асабістага жыцця, з жыцця суразмоўнікаў — герояў твораў, з палескіх вандровак. Каб напісаць гэтыя нарысы, аўтару давялося шмат аб'ездзіць дарог, пратаптаць многа сцежак, нямала выслухаць цікавых людзей Прыбужскага і Прыпяцкага Палесся, Берасцейшчыны.

Трэцяя частка празаічнага зборніка называецца «Бацькоўскімі сцежкамі» і складаецца з адзінаццаці цікавых апавяданняў, нарысаў, журналісцкіх допісаў. Назвы гэтых твораў — «Прабач, вёсачка, да пабачэння!», «Жывая вада», «Дом, дзе жывуць жаваранкі», «Душэўнасць і мудрасць ручнікоў беларускіх», «Песенніцы вёскі Псышчава» і іншыя — гавораць самі за сябе, раскрываюць змест і мэту напісання. Тут — цэлыя россыпы багацця з жыцця нашага палескага краю. Цікава і па-мастацку апісаны Аляксандрам Валковічам нацыянальныя традыцыі і звычаі народа, духоўныя каштоўнасці, народныя святы, абрады, палескі фальклор, падкрэслена непаўторная песеннасць, мастацтва, ткацтва, названы імёны таленавітых, кемлівых і працалюбівых беларусаў-палешукоў, апісана іх душэўная шчырасць, патрыятызм і гатоўнасць прыйсці на дапамогу тым, хто трапіў у бяду.

Асобна хацелася б падкрэсліць менавіта вобразнасць аўтарскай мовы Валковіча. Мастацкі вобраз у ёй — не самамэта, а філасофскі пастулат, нацыянальная традыцыя, жыццёвая народная мудрасць. Гэта ўжо знаёмыя нам вобразы вугроў і буслоў, гэта, напрыклад, такія параўнанні душы Беларусі, як «бялюскае руно ягняці» альбо «вясенняя песня жаўрука». Гэта сказы-афарызмы — «Надзейнейшага за крыж у нашай Айчыне арыенціра не знайсці», альбо «Я быў той другой, захаванай на сялянскую вячэру, надкусанай палавінкай», «Даруй мне за хуткую сцежку ў жыце, пратаптаную напрасткі» і гэтак далей.

Не цураецца пісьменнік скарыстоўваць і дыялектныя словы і выразы. Імі напоўнена гаворка яго герояў. Многае падслухана аўтарам з сапраўды жыватворнай народнай крыніцы — гутарковай размовы палешукоў.

Нямала заснавана на народнай міфалогіі, нямала — на сучасных рэаліях. Напрыклад, уюноў аўтар параўноўвае з Хрыстовымі цвікамі, чужародных канадскіх сомікаў — з бандэраўскімі выпаўзнямі, а дыялектнае палескае слоўца «шахворост» (у нашай вёсцы — шэхворост) нясе сэнс вяртлівых пуг, якія падштурхоўваюць людзей да міжусобіц.

Як патрыёт і сын франтавіка, Аляксандр Міхайлавіч не мог абысці і ваенную тэматыку. Наадварот, ёй пісьменнік прысвяціў не адзін твор, а чатыры — усю заключную частку кнігі, назваўшы яе «Жалобныя даты». Самая трагічная, чорная з дат у нас лічыцца 22 чэрвеня 1941 года, пачатак Вялікай Айчыннай вайны. За ёю ідуць даты ўсіх чатырох ваенных гадоў, бо не было таго дня, каб не гінулі ваенныя і мірныя людзі. Вайна касіла, знішчала мільёны чалавек, калечыла іх, ламала лёсы. У творы «Плыве Вісла» распавядаецца пра трагічны лёс выхаванцаў дзіцячага прытулку пасёлка Дамачава (малая радзіма Валковіча), якіх гітлераўцы 23 верасня 1942 года вывезлі ў лес і расстралялі разам з выхавальніцай. Уратавацца пашчасціла толькі Тосі Шахметавай, якая на хаду выскачыла праз борт машыны і ўцякла, і польскай дзяўчынцы Люціні, якую выхавальніца да прыезду карнікаў паспела вывесці за ручку да знаёмых людзей, дом якіх стаяў непадалёку ад дзіцячага прытулку. Аўтару — у свой час раённаму газетчыку — удалося праз шэраг гадоў адшукаць гэту дзяўчынку, ужо дарослую Люціню, пазнаёміцца, сумесна наведаць трагічныя мясціны яе дзяцінства. Тым самым аддаць доўг і пашану ўсім яе сяброўкам з дзіцячага прытулку, усім загінулым у жудаснай вайне...

У гэтым жа нарысе аўтар распавядае аб трагічнай гісторыі вязняў Дамачаўскага гета, аб амаль трох тысячах чалавечых душ, у адзін дзень закатаваных немцамі ды іх хаўруснікамі-паліцаямі на ўскрайку пасёлка.

У наступным мастацка-дакументальным апавяданні гэтай часткі пад назвай «Залаты кот» распавядаецца пра лёс роднай маці Аляксандра Валковіча — Лідзіі Валковіч (Казловай), гвалтам вывезенай у 1943 годзе ў Германію ў фашысцкае рабства.

І наогул, да чаго толькі не дацягнулася творчая, дапытлівая душа празаіка! Пра мінулае ён шмат чаго даведаўся ад бацькоў, сваякоў, знаёмых, чые лёсы апаліла вайна. Пра цяперашні час пісаць лягчэй, бо сам у ім жыве і ўсё бачыць, вывучае, аналізуе. Пажадаем руплівому творцу і надалей плённа шчыраваць на літаратурнай ніве, новых знаходак, цікавых выданняў, удзячных чытачоў і моцнага здароўя.

**Надзея ПАРЧУК,**
**член Саюза пісьменнікаў Беларусі.**


## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «Смачная восень са «Звяздой»

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Смачная восень са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 1 верасня 2024 года да 31 снежня 2024 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2024 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

### II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| №№ п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт., з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| | Сушылка для гародніны і садавіны Kitfort KT-FP-1940 (далей — суперпрыз) | 1 | 132,00 | 132,00 2 |
| | Сокавыціскалка электрычная Kitfort KT-1150-1 (далей — прыз) | 7 | 45,00 | 315,00 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» складае: 447,00 (Чатырыста сорак сем) рублёў.

### III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Смачная восень са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2024 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2024 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 верасня да 18 кастрычніка 2024 года выразаная з газеты або з дадаткова ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 верасня да 18 кастрычніка 2024 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 24 кастрычніка 2024 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

### IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Смачная восень са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Южык Жанна Міхайлаўна — галоўны таваразнавец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

### V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 25 кастрычніка 2024 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз (суперпрыз), лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 4 лістапада 2024 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 4 лістапада 2024 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

### VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2024 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2024 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2024 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 снежня 2024 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 09:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40 — для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

### VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах:

(017) 271 81 53, 311 17 40.

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# ГОМЕЛЬСКІМІ ВУЛІЦАМІ



Гомель. Чыгуначны вакзал (пач. XX стагоддзя).

**Старыя паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава вяртаюць нас у пачатак XX стагоддзя. Тыя старадаўнія вуліцы, тыя дамы, іншы гарадскі ландшафт Гомеля сто і больш гадоў назад — уся гэтая прастора звязана з людзьмі, з яркімі, прыкметнымі і меней вядомымі асобамі. З тымі людзьмі, якія — хто ў Гомелі і ваколіцах, хто ў Беларусі і Расіі, ды і па ўсім свеце — стваралі новае жыццё, выпрацоўвалі ў нечым і наш сённяшні шлях у будучыню...**


Гомель. Жаночая гімназія (пач. XX стагоддзя).


Гомель. Мужчынская гімназія (пач. XX стагоддзя).

Згадаем імёны хоць бы некаторых руплівых нашых папярэднікаў, хто бачыў Гомель такім, якім ён прадстаўлены на рэпрадукцыях старых паштовак...

4 лістапада 1888 года ў горадзе на Сожы ў сям'і праваслаўнага святара нарадзіўся Аляксандр Сяргеевіч Уклонскі. У 1901 годзе, калі хлопчыку было ўжо дванаццаць гадоў, Уклонскія пераехалі ў Ташкент. Бацька пачаў выкладаць у Ташкенцкай гімназіі, якую Аляксандр закончыў у 1908 годзе. Затым малады чалавек паступіў у Маскоўскі ўніверсітэт на прыродазнаўчае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта. Сваёй спецыяльнасцю наш зямляк абраў геалогію. Універсітэт Уклонскі закончыў па спецыяльнасці «Петраграфія». Дарэчы, першая навуковая праца студэнта называлася «Да петраграфіі ўрочышча Чымган». Даследаванне малады чалавек напісаў на аснове матэрыялаў, якія сабраў падчас летніх вакацый, што праводзіў у Ташкенце. Пасля ўніверсітэта будучы акадэмік працаваў у Варшаўскім політэхнічным інстытуце, які на той час знаходзіўся ў Ніжнім Ноўгарадзе... У 1920 годзе Аляксандр Уклонскі вяртаецца ў Сярэднюю Азію. У 1920-х гг. ураджэнец Гомеля выступае адным з арганізатараў стварэння ў Ташкенце Сярэднеазіяцкага аддзялення Геалагічнага камітэта, на пляцоўцы якога з часам узнікае цэлы шэраг інстытутаў геалагічнага кірунку. Менавіта навуковыя даследаванні Аляксандра Уклонскага, непасрэдных яго вучняў і паплечнікаў даказалі няправільнасць распаўсюджанага раней меркавання, што руды ў Сярэдняй Азіі адсутнічаюць. У 1924 годзе Уклонскі арганізаваў разведку Аўрахміцкага радовішча флюарыту, яго здабычу і перапрацоўку. У 1927 г. пад кіраўніцтвам вучонага здзяйсняецца абгрунтаванне сыравіннай базы цэментнага завода ў Кувасаі. У 1928—1930 гг. Аляксандр Сяргеевіч арганізоўвае калектыў маладых геолагаў для разведкі радовішча серы. У выніку былі адкрыты і ўведзены ў эксплуатацыю Шарсуйскае і Чантыргашскае радовішчы. У лістападзе 1943 г., калі была заснавана Акадэмія навук Узбекскай ССР, А. Уклонскі выбіраецца яе акадэмікам. У 1943 г. нашаму земляку прысвойваюць званне заслужанага дзеяча навукі Узбекскай ССР...



Гомель. Чыгуначны мост (пач. XX стагоддзя).

Памёр ураджэнец Гомеля ў Ташкенце ў 1972 г. і пахаваны на Боткінскіх могілках сталіцы Узбекістана. Чаму б у Ташкенце (Узбекістан) альбо ў Гомелі не назваць адну з вуліц у гонар Аляксандра Уклонскага? Акадэмік гэтага заслугоўвае, ды і такі крок быў бы добрым унёскам у беларуска-ўзбекскае сяброўства...

У Гомелі 3(15) 1897 года нарадзілася Эма Іосіфаўна Хейфец-Выгодская. Бацька яе працаваў акушэрам-гінеколагам у Навабеліцкай рабочай амбулаторыі. Эма закончыла ў 1922 годзе гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З таго часу пачала друкавацца з творамі прыгодніцкага характару, адрасаванымі ў асноўным дзецям. У 1930 годзе наша зямлячка выдала сваю першую кнігу — «Прыгоды Марка Твэна».

